ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 №155

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» для I–V класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–V класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма распрацавана згодна з вучэбным планам першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з улікам колькасці вучэбных гадзін на тыдзень па класах:

у I класе – 2 гадзіны на тыдзень, 60 гадзін у навучальным годзе;

у II класе – 2 гадзіны на тыдзень, 68 гадзін у навучальным годзе;

у III класе – 2 гадзіны на тыдзень, 70 гадзін у навучальным годзе;

у IV класе – 2 гадзіны на тыдзень, 70 гадзін у навучальным годзе;

у V класе – 1 гадзіна на тыдзень, 35 гадзін у навучальным годзе.

3. Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет» – фарміраванне ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю жыццёва важных уяўленняў (ведаў) аб прыродзе, грамадстве і чалавеку, неабходных для рознабаковага ўзаемадзеяння з навакольным светам.

4. Задачы навучання вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет»:

фарміраваць уяўленні вучняў аб прадметным, прыродным і сацыяльным свеце;

знаёміць з прыродай найбліжэйшага асяроддзя, умовамі існавання раслін і жывёл, спосабамі прыстасавання іх да ўмоў навакольнага асяроддзя;

фарміраваць уяўленні аб арганізме чалавека, кампанентах здаровага ладу жыцця і спосабах іх рэалізацыі;

фарміраваць асновы экалагічнай культуры, вопыт прыродаахоўнай дзейнасці;

узбагачаць пачуццёвы вопыт вучняў, развіваць іх эмацыянальна-валявую сферу, навучаць найбольш прадуктыўным спосабам асобасна і сацыяльна значнага ўзаемадзеяння з аб’ектамі навакольнай рэчаіснасці;

фарміраваць нормы сацыяльна прымальных паводзін і перакананне ў неабходнасці прытрымлівання правіл бяспекі ў сацыяльным, прыродным, тэхналагічным асяроддзі;

выхоўваць патрыятызм, пачуццё павагі да культуры і традыцый беларускага народа, імкненне падтрымліваць іх і прымнажаць;

падрыхтоўваць вучняў да засваення ў наступныя гады навучання сістэмы паглыбленых і дыферэнцыраваных ведаў аб чалавеку, грамадстве і прыродзе, іх узаемасувязі.

Змест дадзенай вучэбнай праграмы прадстаўлены трыма ўзаемазвязанымі раздзеламі: «Чалавек і грамадства», «Прырода і чалавек», «Чалавек і яго здароўе».

У працэсе засваення зместу раздзела «Чалавек і грамадства» фарміруюцца ўменні вучняў клапаціцца пра сябе, сваіх блізкіх, арыентавацца ў прадметным і сацыяльным асяроддзі, праяўляць эмацыянальна-каштоўнаснае стаўленне да людзей, прытрымлівацца правіл бяспечных паводзін у штодзённым жыцці. Краязнаўчы матэрыял, уключаны ў гэты раздзел праграмы, садзейнічае выхаванню цікавасці вучняў да сваёй краіны, пашырэнню ўяўленняў аб родным горадзе (сяле), выхаванню павагі да людзей, іх дзейнасці, культурных славутасцей.

Змест раздзела «Прырода і чалавек» накіраваны на фарміраванне асноў экалагічнай культуры, засваенне вучнямі з інтэлектуальнай недастатковасцю ўяўленняў аб сезонных зменах і прыстасаванасці да іх прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага светаў, умовах іх росту, узаемасувязі з'яў у жывой і нежывой прыродзе, выхаванне беражлівага стаўлення да прыродных аб'ектаў і фарміраванне вопыту практычнай прыродаахоўнай дзейнасці.

Матэрыял, прадстаўлены ў раздзеле «Чалавек і яго здароўе», садзейнічае фарміраванню ў вучняў паняцця аб здаровым ладзе жыцця, авалоданню ўяўленнямі аб частках цела чалавека і іх функцыях, засваенню практычных дзеянняў па ўмацаванні і ахове здароўя, якія ляжаць у аснове санагеннай кампетэнцыі і гігіенічнай культуры.

5. Формы і метады рэалізацыі зместу дадзенай вучэбнай праграмы «Чалавек і свет», якія рэкамендуюцца: урокі-гульні, урокі-падарожжы, урокі-адкрыцці, урокі асцярожнасці і іншыя, што забяспечваюць захаванне і падтрыманне працаздольнасці, зняцце фізічнай і псіхічнай напружанасці ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Асаблівае значэнне ў засваенні зместу вучэбнага прадмета маюць мэтавыя прагулкі і экскурсіі, якія дазваляюць вучням спазнаваць навакольны свет праз назіранні, вывучаць навакольныя аб'екты з дапамогай розных органаў пачуццяў, прадстаўляць вынікі пазнання ў выглядзе розных творчых работ (вырабаў, малюнкаў і іншых), набываць вопыт прыродаахоўных паводзін. Пры арганізацыі вучэбнай дзейнасці неабходна навучаць уменням паспяхова дзейнічаць у жыццёвых сітуацыях.

Віды вучэбнай дзейнасці вучняў вызначаюцца ў залежнасці ад крыніцы атрымання інфармацыі: на аснове ўспрымання ў працэсе назірання за аб'ектамі і з'явамі прыроды, дэманстрацыйных доследаў; на слоўнай аснове (расказ настаўніка, тэкст вучэбнага дапаможніка, электронныя адукацыйныя рэсурсы, аўдыя- і відэаматэрыялы).

Пры вывучэнні матэрыялу адукацыйнага кампанента «Чалавек і грамадства» пазнавальныя вучэбныя дзеянні ажыццяўляюцца з дапамогай лагічных аперацый вылучэння прымет аб'ектаў і з'яў,

упарадкавання, параўнання і класіфікацыі на аснове істотных прымет, устанаўлення аналогіі, прычынна-выніковых сувязей; аналізу, сінтэзу, вываду, абагульнення, сістэматызацыі. На ўроках вучні аналізуюць сітуацыі штодзённага жыцця, удзельнічаюць у інсцэніроўках, гульнях-драматызацыях, эцюдах; выконваюць практычныя работы (складанне вучэбных прылад, прыбіранне працоўнага месца).

Рэалізацыя зместу раздзела «Чалавек і прырода» ажыццяўляецца з дапамогай наглядных метадаў: назіранняў – кароткачасовых (за пакаёвымі раслінамі, аб’ектамі і з’явамі нежывой прыроды), працяглых (за ростам і развіццём раслін і жывёл, за зменамі ў прыродзе ў розныя поры года); дэманстрацыі – натуральных аб’ектаў, гербарыя, выяўленчай нагляднасці (ілюстрацый, карцін, схем), доследаў; практычных метадаў – работы з прыродным, непрыдатным і іншым матэрыялам; работы на прышкольным участку, дзейнасці ў прыродзе (пасадка цыбулі, збор лісця для гербарыя, насення на зімовае падкормліванне птушак); выканання творчых работ; замалёвак, складання схем.

Змест раздзела «Чалавек і яго здароўе» забяспечваецца з дапамогай слоўных метадаў (тлумачэння, гутаркі, расказу, чытання ўрыўкаў з мастацкіх твораў, вучэбных дыскусій з абмеркаваннем на даступным узроўні экалагічных і санітарна-гігіенічных праблем і шляхоў іх вырашэння), маўленчых лагічных задач; практычных метадаў (практыкавання ў выкарыстанні прадметаў асабістай гігіены, раскладванні іх па месцах), правядзення доследаў.

Дзейнасць вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю на ўроку павінна грунтавацца на іх моцных баках развіцця, пачуццёвым вопыце, наглядна-практычнай дзейнасці, прымяненні ведаў у жыццёвых сітуацыях. Пры рэалізацыі дыферэнцыраванага і індывідуальнага падыходу на ўроках настаўнік вар’іруе аб’ём і складанасць вучэбнага матэрыялу для розных тыпалагічных груп вучняў, ступень іх самастойнасці пры выкананні вучэбных заданняў, віды дапамогі. Педагог кіруе пазнавальнай дзейнасцю вучняў, дапамагаючы выконваць аналіз, сінтэз, параўнанне і абагульненне, рабіць неабходныя вывады, падводзіць вынікі, заахвочвае расказваць пра практычныя або разумовыя дзеянні, якія выконваюцца.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу.

Вучні ведаюць:

звесткі пра сябе (імя, прозвішча, пол, узрост, адрас);

склад сваёй сям’і, родасныя адносіны ў сям’і;

правы і абавязкі школьнікаў;

назву і прызначэнне прадметаў штодзённага карыстання;

значэнне працы ў жыцці чалавека, прафесіі людзей;

будову цела чалавека;

правілы гігіены, этыкету, сацыяльна прымальных паводзін, бяспечнай жыццядзейнасці;

маюць уяўленне:

аб разнастайнасці прадметаў рукатворнага свету, іх назвах і прызначэнні;

прызначэнні грамадска-бытавых і культурных устаноў найбліжэйшага асяроддзя;

эмацыянальных станах людзей;

неабходнасці культурных і бяспечных паводзін дома, у школе, на вуліцах (дарогах), у грамадскіх месцах;

асноўных фактарах, якія ўмацоўваюць і аслабляюць здароўе чалавека;

Радзіме (дзяржаве, у якой жывуць, нацыянальнай сімволіцы, сталіцы, славутасцях роднага краю);

умеюць:

распазнаваць, паказваць і называць навакольныя прадметы пры непасрэдным успрыманні, на малюнках (па вывучаемых тэмах);

адэкватна выкарыстоўваць навакольныя прадметы ў адпаведнасці з іх функцыянальным прызначэннем;

апранацца ў адпаведнасці з парой года і ўмовамі надвор'я;

выконваць практычнае групаванне (у спалучэнні са слоўнай класіфікацыяй) вывучаемых аб'ектаў;

распазнаваць, паказваць і называць прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага светаў пры непасрэдным успрыманні, на малюнках (па вывучаемых тэмах);

вылучаць адметныя прыметы раслін, жывёл;

вылучаць і называць часткі раслін, цела жывёлы і чалавека;

вызначаць шляхам назіранняў паслядоўнасць і прычыннасць прыродных змен;

выяўляць сувязі і залежнасці ў прыродзе, даступныя назіранню і разуменню вучняў;

выконваць значныя дзеянні па доглядзе раслін і жывёл ў штодзённым жыцці;

праяўляць эмпатычныя пачуцці да аб'ектаў жывой прыроды;

праяўляць клопат аб іншых людзях;

прытрымліваца правіл этыкету ў сувязі з выкананнем розных сацыяльных роляў;

весці кароткія дыялогі, мець зносіны з людзьмі навокал, карыстаючыся агульнапрынятымі нормамі маўленчага этыкету;

праяўляць стрыманасць, не прыцягваць залішняй увагі ў грамадскіх месцах; праяўляць прыязнасць да людзей навокал;

разумець эмацыянальныя станы людзей;

ацэньваць свой знешні выгляд, прыводзіць яго ў адпаведнасць з эстэтычнымі патрабаваннямі;

выконваць правілы гігіены, рэжым дня;

арыентавацца па ўмоўных абазначэннях (шыльдах, надпісах);

прытрымлівацца правіл бяспечнай жыццядзейнасці і сацыяльна прымальных паводзін у штодзённым жыцці;

выконваць правілы дарожнага руху;

называць і паказваць дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь, тлумачыць, што на ёй адлюстравана.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ Ў I–V КЛАСАХ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### I КЛАС
### (60 гадзін)
### АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
### «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (24 гадзіны)

#### Мой клас (4 гадзіны)

Я – вучань (вучаніца). Першы дзень у школе. Знаёмства з настаўнікам.

Аднакласнікі. Знаёмства адно з адным. Імёны дзяўчынак і хлопчыкаў класа. Абавязкі школьніка. Правілы паводзін у класе. Уменні разам гуляць, вучыцца, працаваць, дапамагаць адно аднаму.

Маё месца за сталом у класе. Вучэбныя прылады, іх прызначэнне (сшытак, падручнік, ручка, аловак). Мэбля класа (дошка, стол, крэслы, парты, шафы), яе прызначэнне, месцазнаходжанне. Беражлівае стаўленне да вучэбных прылад і школьнай мэблі.

Я – дзяжурны. Мае абавязкі, вынікі працы.

Практычная дзейнасць

Арыентаванне ў класе. Знаходжанне свайго месца за сталом. Вылучэнне вучэбных прылад з мноства прадметаў; групаванне цацак і вучэбных прылад. Складванне вучэбных прылад за партай, укладванне іх у партфель. Выкананне абавязкаў дзяжурнага (выціранне дошкі, паліў кветак).

#### Мая школа (4 гадзіны)

Мая школа. Школьныя памяшканні, іх прызначэнне, размяшчэнне (класы, сталовая, медпункт, актавая зала, спартыўная зала). Школьны двор. Прафесіі работнікаў школы (настаўнік, выхавальнік, урач, кухар).

Практычная дзейнасць

Арыентаванне ў будынку школы, знаходжанне школьных памяшканняў, пазнаванне работнікаў школы.

Я і людзі вакол (4 гадзіны)

Звесткі пра сябе: імя, прозвішча, узрост. Я – хлопчык (дзяўчынка). Мае магчымасці, жаданні, захапленні (што я магу, хачу, люблю рабіць).

Ветлівыя словы, сітуацыі іх выкарыстання. Уменні ветліва вітацца, развітвацца, дзякаваць, прасіць прабачэння, звяртацца па дапамогу.

Правілы паводзін вучня: што можна рабіць, што нельга. Добрыя і дрэнныя ўчынкі. Мой настрой і паводзіны ў розных жыццёвых сітуацыях.

Практычная дзейнасць

Называнне сваіх імя, прозвішча, узросту (паказванне на пальцах). Практыкаванне ў выкарыстанні ветлівых слоў у розных сітуацыях. Выражэнне свайго настрою, патрэбнасцей з дапамогай маўленчых і немаўленчых сродкаў. Аналіз канкрэтных спраў, учынкаў дзяцей.

Мая сям’я (4 гадзіны)

Я і мая сям’я. Склад сям’і. Роднасныя адносіны. Імёны членаў сям’і. Добразычлівыя адносіны ў сям’і. Размеркаванне абавязкаў у сям’і. Пасільная дапамога дзяцей іншым членам сям’і. Правы і абавязкі дзяцей і бацькоў. Адказнасць дзяцей за свае ўчынкі.

Сямейныя святы: дні нараджэння членаў сям’і, Новы год і іншыя.

Практычная дзейнасць

Пазнаванне, называнне і паказванне членаў сям’і на фатаграфіі. Аказанне пасільнай дапамогі членам сям’і, выкананне дамашніх абавязкаў. Выкананне элементарных правіл бяспекі ў побыце.

Прадметы вакол мяне (4 гадзіны)

Цацкі (лялька, мяч, піраміда, машына), іх колеры, формы, памеры, матэрыял, з якога зроблены. Адрозненні цацак ад школьных прылад. Беражлівае стаўленне да цацак, раскладванне іх па месцах пасля гульні.

Посуд для прыгатавання ежы (каструля, патэльня), для ўжывання ежы (глыбокая і мелкая талеркі). Сталовыя прыборы (лыжка, відэлец, нож).

Мэбля (стол, крэсла, ложак, шафа), яе прызначэнне. Часткі прадметаў мэблі (спінка, сядзенне, ножкі).

Адзенне. Адзенне для хлопчыкаў (кашуля, штаны, шорты), дзяўчынак (сукенка, спадніца, кофта). Парныя прадметы адзення і абутку (рукавіцы, шкарпэткі, чаравікі), суаднясенне іх з пэўнымі часткамі цела. Паслядоўнасць апранання і распранання. Раскладванне адзення на крэсле, развешванне ў шафе. Адзенне і абутак для розных умоў надвор’я і пор года.

Практычная дзейнасць

Дарослы называе і паказвае прадмет. Групаванне прадметаў па зададзенай прымеце. Выкананне гульнявых дзеянняў з цацкамі. Рацыянальнае выкарыстанне навакольных прадметаў у адпаведнасці з прызначэннем, раскладванне іх па месцах. Складанне парных прадметаў адзення і абутку (рукавіц, шкарпэтак, чаравікаў), суаднясенне іх з пэўнымі часткамі цела. Раскладванне адзення на крэсле, развешванне ў шафе.

Мая краіна (4 гадзіны)

Мой горад (пасёлак, сельскі населены пункт). Вуліца, на якой я жыву. Установы грамадска-бытавога прызначэння (паліклініка, аптэка, магазін).

Краіна, у якой я жыву, – Рэспубліка Беларусь. Мінск – галоўны горад краіны, сталіца Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

Практычная дзейнасць

Называнне краіны (дзяржавы). Экскурсія па населеным пункце. Арыентаванне на вуліцы паблізу свайго дома, школы. Пазнаванне галоўных славутасцей свайго горада (пасёлка, сельскага населенага пункта).

Віды дзейнасці: работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, пазнаванне дзяржаўнай сімволікі, мадэліраванне сітуацый.

АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
«ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК» (26 гадзін)

Прырода вакол нас (2 гадзіны)

Аб’екты жывой і нежывой прыроды, іх прыметы. Сонца – крыніца святла і цяпла для ўсяго жывога на Зямлі. Гукі прыроды.

Змяненне стану неба і ападкаў у розныя поры года. Сезонныя змены ў жыцці раслін і жывёл, працы людзей. Уплыў змен у прыродзе на жыццё чалавека.

Часавыя ўяўленні: часткі сутак (дзень, ноч), іх прыметы.

Практычная дзейнасць

Адрозніванне гукаў прыроды (шум дажджу, шолах лістоты, рыпенне снегу, гук ветру). Назіранні за змяненнем стану неба і ападкаў у розныя поры года. Адрозніванне дня і ночы, суаднясенне з дзейнасцю людзей.

Раслінны свет (8 гадзін)

Дрэвы ліставыя (бяроза, клён), хвойныя (елка, сасна). Лісце, плады, насенне: формы, колеры, памеры. Расліны бліжэйшага акружэння.

Пакаёвыя расліны (герань, фікус). Догляд пакаёвых раслін (пасадка, рыхленне, паліванне, апырскванне, праціранне пылу з лісця).

Кветкі лугу і саду (дзьмухавец, рамонак, ружа). Будова раслін: корань, сцябло, ліст (кветка).

Агарод. Агародніна (агурок, памідор, капуста, бульба, буракі). Сад. Садавіна (яблык, груша, сліва). Асаблівасці знешняга выгляду, месца вырастання. Правілы ўжывання агародніны і садавіны. Праца людзей у агародзе і садзе (пасадка, паліванне, праполка, збор ураджаю). Спосабы ўжывання ў ежу агародніны, садавіны.

Практычная дзейнасць

Распазнаванне дрэў і кустоў (па лісці). Называнне, паказванне, параўнанне па велічыні, форме, колеры, смаку агародніны і садавіны. Выкананне абследавальніцкіх дзеянняў па вызначэнні прымет прадметаў. Збор ураджаю агародніны і садавіны. Складванне агародніны і садавіны ў кошык, перакладанне іх у пакет. Догляд раслін (паліванне, выдаленне сухога лісця).

Жывёльны свет (8 гадзін)

Свойская жывёла (кот, сабака, карова, конь) і яе дзіцяняты. Свойская птушка (курыца, певень, гусак) і птушаняты. Асаблівасці знешняга выгляду, месца пражывання. Клопат чалавека аб свойскай жывёле і птушках.

Дзікія жывёлы (воўк, заяц, мядзведзь, вожык) і іх дзіцяняты. Асаблівасці знешняга выгляду, голас, звычкі, асяроддзе пражывання.

Пералётныя птушкі (бусел, ластаўка). Зімуючыя птушкі (варона, верабей). Асаблівасці знешняга выгляду. Зіма – галодны час у жыцці птушак. Дапамога птушкам зімой.

Насякомыя (муха, жук, матылёк). Адметныя прыметы знешняга выгляду.

Практычная дзейнасць

Назіранні за жывёламі ў прыродзе. Распазнаванне ў найбліжэйшым прыродным асяроддзі птушак, звяроў, насякомых па асаблівасцях знешняга выгляду. Пазнаванне птушак і звяроў на фатаграфіях і ілюстрацыях. Выраб сумесна з дарослымі шпакоўняў, кармушак для птушак, развешванне іх на дрэвах, папаўненне кормам.

Поры года (8 гадзін)

Сезонныя змены ў жыцці раслін і жывёл, працы людзей. Арганізацыя экскурсій, мэтавых прагулак, назіранняў за аб'ектамі прыроды ў розныя поры года.

Восень.

Змены ў нежывой прыродзе: змяншэнне працягласці дня, пахаладанне, ападкі (дождж).

Расліны восенню. Змяненне афарбоўкі лісця дрэў і кустоў, лістапад; завяданне і засыханне травяністых раслін; паспяванне пладоў і насення.

Жыццё жывёл восенню. Змяншэнне колькасці птушак, звяроў, насякомых; пералёты птушак; змяненне афарбоўкі шэрсці ў звяроў (заяц); заляганне ў спячку (мядзведзь). Клопат чалавека аб свойскай жывёле (нарыхтоўка кармоў, падрыхтоўка да зімы памяшканняў для жывёл).

Праца людзей восенню. Восеньскія работы ў агародах, садах, парках: збор і перапрацоўка ўраджаю агародніны і садавіны, грыбоў, зграбанне лісця.

Адзенне і абутак па сезоне: куртка, плашч, шапка, боты. Выбар адзення і абутку адпаведна надвор'ю. Восеньскія прагулкі на свежым паветры, іх уплыў на здароўе і настрой чалавека.

Восеньскія забавы дзяцей: складанне букетаў з восеньскага лісця, збор пладоў (жалудоў, каштанаў, арэхаў), вырабы з прыроднага матэрыялу.

Зіма.

Змяненні ў нежывой прыродзе. Працягласць дня і ночы. Змяненні тэмпературы паветра і стану вады, ападкі. Мароз, снег, лёд, снегапад.

Расліны зімой. Травяністыя расліны пад снегам. Хвойныя і ліставыя дрэвы зімой. Вызначэнне відаў дрэў па пладах, якія засталіся, шышках (хвойныя дрэвы).

Жыццё жывёл зімой. Спячка жывёл (вожык, мядзведзь). Змяненні ў жыцці лясных звяроў (вавёрка, заяц, воўк). Дапамога людзей дзікім жывёлам.

Праца людзей зімой. Уборка снегу на вуліцах, пасыпанне слізкіх дарог пяском, соллю, падкормліванне птушак, выраб кармушак.

Адзенне і абутак па сезоне: футра, шалік, шапка, рукавіцы, боты. Выбар адзення па надвор'і, паслядоўнасць апranання (распранання).

Зімовыя гульні і забавы дзяцей. Катанне на санках, каньках, лыжах. Лепка і кіданне снежак. Упрыгожванне навагодняй ёлкі. Святкаванне Новага года.

Вясна.

Змены ў нежывой прыродзе: працягласць дня і ночы, павышэнне тэмпературы паветра. Раставанне снегу, праграванне і прасыханне глебы.

Расліны вясной. Абуджэнне раслін – набраканне пупышак, распусканне лісця, цвіценне дрэў і кустоў.

Жыццё жывёл вясной. Прылёт і гнездаванне птушак. З’яўленне насякомых.

Праца людзей вясной. Вясновыя работы на палях, у садах, парках: аранне зямлі, пасеў насення, пасадка бульбы, бяленне ствалоў дрэў. Дапамога дарослым у вясновых работах.

Адзенне і абутак па сезоне: куртка, плашч, шапка, гумавыя боты.

Вясновыя забавы дзяцей. Выраб і пусканне караблікаў.

Лета.

Змены ў нежывой прыродзе: працягласць дня і ночы. Лета – самая цёплая пара года. Праграванне паветра, вады, глебы. Летнія дажджы, навальніцы.

Расліны летам. Цвіценне траў, паспяванне ягад, агародніны.

Жыццё жывёл летам. Звычкі дзікіх звяроў, птушак, іх клопат аб патомстве. Правілы паводзін у лесе, пры сустрэчы са звярамі, птушкамі, насякомымі.

Праца людзей летам: праполка, паліў раслін, збор агародніны, грыбоў і ягад.

Адзенне і абутак па сезоне: сукенка, спадніца, шорты, майка, басаножкі. Галаўныя ўборы: панама, кепка, хустка. Правілы паводзін у спякотнае надвор’е.

Летнія забавы дзяцей: катанне на веласіпедзе, гульні з мячом.

Практычная дзейнасць

Вылучэнне аб’ектаў прыроды з шэрагу іншых аб’ектаў, называнне прымет сезона пры непасрэдным успрыманні. Вызначэнне і аналіз сезонных змен у нежывой прыродзе, у жыцці раслін і жывёл; фіксацыя вынікаў назіранняў. Распазнаванне 2–3 відаў дрэў і кустоў (па лісці); агародніны і садавіны; пазнаванне птушак, звяроў.

Збор прыроднага матэрыялу: рознакаляровага лісця (каштанаў, жалудоў), складанне восеньскіх букетаў. Выкананне аплікацый, замалёўкі прыродных умоў і з’яў.

Экскурсіі, мэтавыя прагулкі «Жыццё птушак восенню (зімой, вясной, летам)», «Залатая восень у прыродзе», «Снегапад, сняжынкі, гурбы», «Ранняя вясна – час абуджэння раслін», «Раннеквітнеючыя расліны – упрыгажэнне прыроды».

Дэманстрацыя доследаў: вызначэнне ўласцівасцей пяску (летам); снег і лёд – гэта замёрзлая вада; вызначэнне ўласцівасцей снегу (зімой).

Падкормліванне птушак, выраб кармушак.

Выкананне правіл бяспечных паводзін у прыродзе ў розныя поры года.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (10 гадзін)

### Часткі цела (4 гадзіны)

Часткі цела чалавека (галава, шыя, тулава, рукі, ногі).

Органы пачуццяў, іх размяшчэнне на целе чалавека, функцыі. Вызначэнне прымет навакольных прадметаў (утвараемых гукаў, колеру, смаку, паху, матэрыялу, вагі) з дапамогай органаў пачуццяў.

Практычная дзейнасць

Паказванне частак цела, абазначэнне іх словамі і невербальнымі сродкамі. Вызначэнне прымет навакольных прадметаў (гукаў, колеру, смаку, паху, матэрыялу, вагі) з дапамогай органаў пачуццяў.

Асабістая гігіена (2 гадзіны)

Знешні выгляд вучня. Прадметы асабістай гігіены (мыла, зубная паста, зубная шчотка, расчоска, ручнік, насоўка), прызначэнне, спосаб выкарыстання.

Практычная дзейнасць

Выкананне дзеянняў з прадметамі асабістай гігіены (расчасаць валасы, выцерці рукі).

Рэжым дня (2 гадзіны)

Рэжым дня ў школе і дома. Ранішняя гімнастыка, гігіенічныя працэдуры. Фізічныя практыкаванні, прагулка, гульні на свежым паветры, іх значэнне для ўмацавання здароўя.

Практычная дзейнасць

Складанне рэжыму дня (сумесна з педагогам). Развучванне фізічных практыкаванняў (2–3) для ранішняй гімнастыкі.

Прафілактыка захворванняў (2 гадзіны)

Эпідэмія. Правілы паводзін у перыяд сезонных эпідэмій. Правілы паводзін падчас хваробы: выкананне прызначэнняў урача, ужыванне лякарстваў пад кантролем дарослага.

Практычная дзейнасць

Паведамленне аб сваім недамаганні дарослым. Удзел у сюжэтнай гульні «У доктара».

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

пра сябе (свае імя, прозвішча, узрост);

склад сваёй сям'і;

побытавыя прадметы, якія выкарыстоўваюцца штодня, іх прызначэнне;

школу, у якой вучацца, і свой клас;

горад і краіну пражывання;

агародніну, садавіну, кветкі і дрэвы (асаблівасці знешняга выгляду);

жывёл і іх дзіцянят (2–3 на выбар);
прыродныя з’явы (дождж, снег);
поры года;
часткі цела чалавека;
рэжым дня школьніка.
Уменні:
выкарыстоўваць ветлівыя словы падчас прывітання, развітання, выказвання падзякі за паслугу, выбачэння, звароту па дапамогу да дарослых і равеснікаў;
арыентавацца ў класе, памяшканнях школы;
раскладваць па месцах цацкі;
выбіраць вучэбныя прылады, адзенне, абутак, посуд па прызначэнні;
выконваць абавязкі дзяжурнага;
паказваць і называць часткі цела;
выконваць правілы асабістай гігіены, выкарыстоўваць прадметы гігіены пры ранішнім і вячэрнім туалеце, раскладваць прадметы па месцах.
Вучні ведаюць і прымяняюць у розных відах дзейнасці:
свае прозвішча і імя;
сваю краіну, населены пункт;
пазнаюць дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь (сцяг і герб);
разумеюць элементарныя прыметы паняццяў «прырода», «нежывая прырода», «жывая прырода», «прадметы працы»;
адрозніваюць цацкі і школьныя прылады;
арыентуюцца ў школьных памяшканнях;
знаходзяць сваё працоўнае месца ў класе;
пазнаюць і называюць вучэбныя рэчы і прызначэнне кожнага прадмета;
удзельнічаюць у зборы прыроднага матэрыялу;
даглядаюць пакаёвыя расліны;
выконваюць простыя сезонныя работы ў агародзе.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:
прадметныя ўяўленні і ўменні ў навучальных і натуральных сітуацыях (вырабляюць і пускаюць караблікі; выконваюць аплікацыі, замалёўкі пагодных і прыродных з’яў; складаюць восеньскія букеты);
прадметныя ўяўленні і ўменні ў гульнях-драматызацыях, інсцэніроўках («Знаёмства з аднакласнікамі», «Букет настаўніку», «Не магу знайсці сваё месца», «Забыўся, як завуць настаўніцу»);
у доследнай дзейнасці (сарціроўцы прыроднага матэрыялу, выяўленні ўласцівасцей пяску).
Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:
ветліва звяртаюцца да настаўніка, аднакласнікаў, блізкіх;

імкнуцца быць ахайнымі;

аказваюць пасільную дапамогу аднакласнікам, членам сям'і;

клапоцяцца пра жывёл у прыродзе (вырабляюць шпакоўні, кормяць звяроў і птушак);

удзельнічаюць у пасільнай працоўнай дзейнасці.

## II КЛАС
## (68 гадзін)
## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (32 гадзіны)

### Я і людзі вакол (2 гадзіны)

Звесткі пра сябе: імя, прозвішча, узрост. Дамашні адрас. Любімыя заняткі (замацаванне).

Імёны хлопчыкаў і дзяўчынак. Ветлівыя словы, іх выкарыстанне ў зносінах з дарослымі і дзецьмі ў сітуацыях прывітання, развітання, выказвання падзякі, прабачэння і іншых. Добрыя і дрэнныя ўчынкі вучняў. Правілы паводзін у грамадскіх месцах.

Практычная дзейнасць

Узнаўленне сацыяльна значнай інфармацыі пра сябе (імя, прозвішча, узрост). Разыгрыванне сітуацый з мэтай абмеркавання паводзін герояў казак і мультфільмаў. Выкарыстанне ветлівых слоў у зносінах з дарослымі і дзецьмі. Удзел у сітуацыях віншавання і прыняцця віншаванняў.

### Мой клас (4 гадзіны)

Мой клас. Маё месца для вучобы, гульняў. Мэбля класа. Вучэбныя прылады (падручнік, сшытак, альбом, ручка, аловак, пэндзлік, фарбы, пластылін), іх прызначэнне. Правілы паводзін на ўроку і на перапынку. Дзяжурства.

Практычная дзейнасць

Падрыхтоўка да ўрока, выбар пэўных вучэбных прылад. Ацэньванне стану працоўнага месца (акуратнае, неакуратнае). Выкананне абавязкаў вучня, дзяжурнага. Падтрыманне чысціні на парце, у класе.

### Мая школа (4 гадзіны)

Школьны будынак, прызначэнне кожнага памяшкання. Прышкольны ўчастак. Прызначэнне школьных пабудоў (стадыёна, спартыўнай пляцоўкі, пляцоўкі для гульняў, месцаў для адпачынку). Прафесіі работнікаў школы: настаўнік, выхавальнік, бібліятэкар, кухар, урач, прыбіральшчыца.

Практычная дзейнасць

Арыентаванне ў школьным будынку (сталовай, туалеце, спартыўнай зале, актавай зале, кабінеце ўрача). Беражлівае стаўленне да школьнай маёмасці. Ветлівы зварот да работнікаў школы (прывітанне, выказванне падзякі, развітанне).

Мая сям’я (4 гадзіны)

Склад сям’і. Роднасныя адносіны. Шчаслівая сям’я: клопат дарослых і дзяцей адно пра аднаго. Дапамога членаў сям’і ў выкананні хатніх абавязкаў. Сямейныя святы (дні нараджэння, Новы год, Вялікдзень).

Мая кватэра. Пакоі, іх прызначэнне (кухня, дзіцячы пакой, гасцёўня, спальня).

Практычная дзейнасць

Называнне членаў сям’і, устанаўленне роднасных адносін, удзел у падрыхтоўцы да сямейных свят. Удзел у сюжэтнай гульні «Сям’я» (сюжэты для разыгрывання: «Дапамагаем маме разабраць сумку з прадуктамі», «Наведваем хворую бабулю», «Святкуем дзень нараджэння таты», «Адзначаем Новы год»). Вызначэнне прызначэння пакояў у кватэры па іх прадметным напаўненні. Абмеркаванне правіл падтрымання парадку ў кватэры.

Прадметы вакол мяне (10 гадзін)

Цацкі, іх назвы, прызначэнне, правілы выкарыстання. Настольна-друкаваныя гульні (лато, даміно), гульні з канструктарам. Правілы гульні. Узаемаадносіны дзяцей у гульні.

Посуд для прыгатавання ежы (каструля, патэльня, чайнік), ужывання ежы (талерка, сподак), піцця (кубак, шклянка). Сталовыя прыборы.

Адзенне. Адзенне святочнае і штодзённае. Адзенне для зімы і лета. Называнне прадметаў адзення, яго частак (каўнер, кішэня). Абутак (туфлі, боты, чаравікі, тапкі, красоўкі). Прызначэнне абутку (для дома, вуліцы, заняткаў спортам).

Догляд адзення (мыццё, прасушванне, прасаванне, акуратнае складванне або развешванне на вешалцы).

Мэбля (стол, крэсла, канапа, ложак, тумбачка), яе прызначэнне.

Беражлівае стаўленне да цацак і прадметаў побыту.

Практычная дзейнасць

Выбар атрыбутаў для гульні. Адрозніванне посуду для прыгатавання і ўжывання ежы. Сервіроўка стала да снедання, абеду, падвячорка (піцця чаю). Выбар адзення (абутку) з улікам умоў надвор’я, прызначэння (для заняткаў спортам, наведвання тэатра). Раскладванне цацак і бытавых прадметаў па месцах.

Мая краіна (4 гадзіны)

Краіна, у якой мы жывём. Горад Мінск – сталіца Рэспублікі Беларусь. Беларусы – добры і гасцінны народ. Родная мова беларусаў. Нацыянальныя стравы. Нацыянальнае адзенне, часткі нацыянальнага касцюма (кашуля, штаны, пояс).

Мой горад (пасёлак, сельскі населены пункт) (4 гадзіны)

Родны горад (пасёлак, сельскі населены пункт), яго назва. Галоўная вуліца, плошча. Прыгожыя месцы і будынкі, іх назвы і прызначэнне. Шматпавярховыя і аднапавярховыя дамы. Матэрыял, з якога зроблены будынкі. Установы (арганізацыі) сацыяльна-культурнага прызначэння ў горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце). Знаходжанне патрэбнага будынка па шыльдзе.

Практычная дзейнасць

Экскурсіі ў горад (пасёлак, сельскі населены пункт), мэтавая прагулка «Мы на галоўнай плошчы»; назіранні за будынкамі ў горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце). Прагляд і абмеркаванне відэафільмаў аб роднай краіне. Распазнаванне дзяржаўнай сімволікі. Арыентаванне ў горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце). Пазнаванне ўстаноў бытавога абслугоўвання. Практычная рэалізацыя правіл культурных паводзін у горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце), узаемадзеянне з людзьмі навокал (на вуліцы, у магазіне).

АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
«ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК» (26 гадзін)

Прырода вакол нас (4 гадзіны)

Аб'екты нежывой прыроды (зямля – пясок, камяні, гліна). Сонца, вада, зямля. Іх значэнне ў жыцці людзей: сонца – крыніца цяпла і святла; вада – крыніца жыцця.

Прыродныя з'явы і станы нежывой прыроды ў розныя поры года (холадна, горача, воблачна, ясна, вецер, дождж, снег, ледзяшы, раставанне снегу). Адрозніванне гукаў прыроды (шум дажджу, гул ветру, шолах лістоты, рыпенне снегу).

Часавыя ўяўленні. Часткі сутак (раніца, дзень, вечар, ноч), іх паслядоўнасць. Дзейнасць чалавека на працягу сутак.

Практычная дзейнасць

Назіранне за дзённым і вячэрнім небам. Практыкаванне ў пазнаванні і называнні частак сутак, вылучэнні прымет дня і ночы, суаднясенні часу сутак са зменамі ў прыродзе і дзейнасцю людзей.

Раслінны свет (10 гадзін)

Разнастайнасць раслін: травяністыя расліны, кусты, дрэвы. Умовы росту раслін: святло, вада, цяпло, глеба.

Дрэвы, кусты, травяністыя расліны: асаблівасці знешняга выгляду, будова, формы лісця (акруглы край ліста, зубчасты край ліста). Значэнне дрэў, кустоў, травяністых раслін у жыцці чалавека і жывёл.

Дзікарослыя ліставыя дрэвы (3–4 на выбар). Хвойныя дрэвы, іх адметныя прыметы. Кусты (бэз, шыпшына).

Садовыя дрэвы (яблыня, груша, вішня, сліва). Ягадныя кусты (парэчка, агрэст). Плады садовых дрэў і ягадных кустоў. Колеры, формы, памеры, смак пладоў. Правілы ўжывання ў ежу садавіны і ягад.

Расліны агарода (агурок, морква, цыбуля, бурак, капуста і іншыя). Параўнанне па форме, колеры і памеры. Значэнне раслін агарода ў жыцці чалавека. Правілы і спосабы ўжывання агародніны ў ежу (у сырым і вараным выглядзе).

Грыбы ядомыя і ядавітыя (баравік, лісічка, мухамор). Будова грыба (шапачка, ножка). Правілы збору грыбоў. Прыгатаванне страў з грыбоў.

Пакаёвыя расліны, асаблівасці іх знешняга выгляду. Умовы росту і жыцця пакаёвых раслін (святло, цяпло, добрая глеба, вада). Беражлівае і клапатлівае стаўленне да пакаёвых раслін.

Прышкольны ўчастак. Арыентаванне на прышкольным участку. Расліны кветніка, саду, агарода.

Практычная дзейнасць

Распазнаванне раслін у прыродзе і на малюнках (разгляданне, абмацванне), выкананне перцэптыўных дзеянняў па вылучэнні іх знешніх частак; замалёўка раслін, размалёўванне, канструяванне іх з палачак, нанізванне, збор пладоў у кантэйнер. Практыкаванне ў складанні букета і ўручэнні яго сябру (работніку школы). Удзел у пасадцы цыбулі (у класе), зборы ўраджаю (у агародзе). Назіранне за ростам і развіццём раслін у класе, прыродзе. Догляд пакаёвых раслін (паліў, абрыванне сухога лісця). Падрыхтоўка агародніны і садавіны да ўжывання ў ежу. Экскурсія ў магазін агародніны.

Жывёльны свет (8 гадзін)

Дзікая і свойская жывёла. Значэнне жывёл у жыцці чалавека. Характэрныя асаблівасці знешняга выгляду жывёл (грыва – у каня, рогі і вымя – у каровы, казы). Умовы існавання дзікай і свойскай жывёлы. Спосабы здабывання ежы дзікімі жывёламі. Харчаванне свойскай жывёлы.

Свойская жывёла (карова, конь, свіння), яе дзіцяняты. Клопат чалавека аб свойскай жывёле.

Дзікія жывёлы (воўк, ліса, мядзведзь, заяц, вожык, вавёрка), іх дзіцяняты.

Дзікая і свойская птушка: знешнія прыметы, будова цела (галава, шыя, крылы, ногі, хвост), асаблівасці.

Свойская птушка (курыца, гусь, качка, індычка), яе птушаняты. Клопат чалавека аб свойскай птушцы. Значэнне свойскай птушкі ў жыцці чалавека.

Пералётныя птушкі (грак, шпак, бусел, ластаўка).

Зімуючыя птушкі (голуб, сарока, сініца, дзяцел, снягір). Умовы іх жыцця зімой. Дапамога птушкам зімой (выраб кармушак, падкормліванне).

Насякомыя (муха, камар, жук, матылёк). Значэнне насякомых у раслінным і жывёльным свеце.

Практычная дзейнасць

Назіранні за жывёламі і птушкамі ў прыродзе. Разгляданне фатаграфій і ілюстрацый з выявамі аб’ектаў жывой прыроды. Пазнаванне і паказванне жывёл і птушак у найбліжэйшым прыродным асяроддзі. Вылучэнне, паказванне і называнне частак цела тых жывёл, птушак, якія вывучаюцца. Вылучэнне істотных прымет жывёл, птушак. Групаванне жывёлы (свойская, дзікая), абагульненне і канкрэтызацыя (конь, свіння, каза – гэта ...; свойская жывёла – гэта ...). Дапамога жывёлам і птушкам у розныя поры года (падкормліванне, чыстка клетак, удзел у вырабе кармушак і іншае).

Поры года (4 гадзіны)

Паслядоўнасць змены пор года. Восеньскія, зімовыя, вясновыя, летнія месяцы. Працягласць дня і ночы ў розныя поры года.

Восень. Ранняя, залатая, позняя восень.

Змены ў нежывой прыродзе: змяншэнне працягласці дня, пахаладанне, стан неба, ападкі (дождж). Ясныя і пахмурныя дні.

Расліны восенню. Змяненне афарбоўкі лісця дрэў і кустоў, лістапад; завяданне і засыханне травяністых раслін; паспяванне пладоў і насення.

Жыццё жывёл восенню. Змяншэнне колькасці птушак, звяроў, насякомых; пералёты птушак; змяненне афарбоўкі шэрсці ў звяроў (заяц, вавёрка); заляганне ў спячку (мядзведзь, вожык).

Праца людзей восенню. Восеньскія работы на палях, у агародах, садах, парках: збор і нарыхтоўка на зіму ўраджаю агародніны і садавіны, збор грыбоў, насення; перакопванне глебы; зграбанне апалага лісця.

Адзенне і абутак па сезоне. Выбар адзення, абутку, атрыбутаў (парасон) адпаведна надвор’ю.

Восеньскія забавы дзяцей: складанне букетаў з восеньскага лісця, збор пладоў (жалудоў, каштанаў, арэхаў), выкананне вырабаў з прыроднага матэрыялу.

Зіма.

Змены ў нежывой прыродзе: працягласць дня і ночы, змены тэмпературы паветра і вады, ападкі. Замярзанне вадаёмаў. Правілы

паводзін у снегапад, падчас галалёду, пры катанні на каньках, лыжах, санках.

Расліны зімой. Травяністыя расліны пад снегам. Хвойныя і ліставыя дрэвы зімой. Вызначэнне відаў дрэў па пладах, якія засталіся, шышках (хвойныя дрэвы).

Жыццё жывёл зімой. Спячка жывёл (вожык, мядзведзь). Змяненні ў жыцці лясных звяроў (вавёрка, заяц, воўк). Дапамога людзей дзікім жывёлам.

Праца людзей зімой: уборка снегу на вуліцах, пасыпанне слізкіх дарог пяском, соллю. Падкормліванне птушак, выраб кармушак.

Адзенне і абутак па сезоне. Выбар адзення па надвор'і, сітуацыі; паслядоўнасць апранання (распранання).

Зімовыя гульні і забавы дзяцей. Катанне на санках, лыжах, каньках. Лепка і кіданне снежак. Святкаванне Новага года. Атрыбутыка свята, сумесная падрыхтоўка да святкавання. Навагоднія віншаванні равеснікаў і дарослых.

Вясна.

Змены ў нежывой прыродзе: працягласць дня і ночы, пацяпленне. Раставанне снегу, крыгаход, праграванне і прасыханне глебы. Вясновыя навальніцы.

Расліны вясной. Абуджэнне раслін: набраканне пупышак, распусканне лісця, цвіценне дрэў і кустоў. Першыя вясновыя кветкі: ландыш, падснежнік, сон-трава.

Жыццё жывёл вясной. Прылёт і гнездаванне птушак. Вывядзенне птушанят. Залежнасць тэрмінаў прылёту птушак ад наяўнасці корму. З'яўленне насякомых.

Праца людзей вясной. Вясновыя работы на прышкольным участку, у садах: абкопванне дрэў і кустоў, аранне зямлі, пасеў насення, пасадка бульбы, бяленне ствалоў дрэў.

Адзенне і абутак па сезоне: куртка, плашч, шапка, гумавыя боты.

Вясновыя забавы дзяцей: выраб і пусканне караблікаў. Падрыхтоўка да святкавання 8 Сакавіка. Віншаванне мам, бабуль, сясцёр, аднакласніц.

Лета.

Змены ў нежывой прыродзе: працягласць дня і ночы. Лета – самая цёплая пара года. Праграванне паветра, вады, глебы. Летнія дажджы, навальніцы.

Расліны летам. Цвіценне траў, паспяванне ягад, агародніны.

Жыццё жывёл летам. Звычкі дзікіх звяроў, птушак, іх клопат аб патомстве. Правілы паводзін у лесе, пры сустрэчы са звярамі, птушкамі, насякомымі.

Праца людзей летам: праполка, паліў раслін, збор агародніны, грыбоў і ягад.

Адзенне і абутак па сезоне: сукенка, спадніца, шорты, майка, басаножкі. Галаўны ўбор: панама, кепка, хустка. Правілы паводзін у спякотнае надвор’е.

Летнія забавы дзяцей: загаранне і купанне. Правілы паводзін у вадзе. Гульні на паветры як умова захавання і ўмацавання здароўя.

Практычная дзейнасць

Назіранні за станам аб’ектаў прыроды. Экскурсіі, мэтавыя прагулкі ў парк (лес) у кожную пару года. Называнне прымет сезона пры непасрэдным успрыманні.

Доследы, якія падводзяць да ўсведамлення, што снег і лёд – гэта замёрзлая вада; вызначэнне чысціні снегу. Распазнаванне некалькіх відаў дрэў і кустоў у зімовы час (па форме кроны, колеры ствала, галінках, пладах, якія засталіся, лісці, шышках (хвойныя дрэвы)); пазнаванне некалькіх відаў птушак, звяроў.

Падкормліванне птушак, выраб кармушак. Практычныя дзеянні па выбары адзення, абутку, атрыбутаў у адпаведнасці з сезонам.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (10 гадзін)

### Часткі цела чалавека (4 гадзіны)

Часткі цела чалавека: галава, шыя, тулава (грудзі, жывот, спіна), рукі, ногі. Пальцы на руках, іх колькасць, назвы.

Твар, яго часткі: лоб, шчокі, нос, губы, вочы (бровы, вейкі).

Органы пачуццяў. Вока – орган зроку. Вуха – орган слыху. Нос – орган нюху. Язык – орган смаку. Скура – орган дотыку.

Практычная дзейнасць

Паказ частак цела на сабе, таварышы, ляльцы, вызначэнне іх функцый. Практычныя дзеянні па адрозніванні правага і левага боку цела, вызначэнні з дапамогай органаў пачуццяў уласцівасцей і якасцей прадметаў.

Вызначэнне прымет прадметаў з дапамогай органаў пачуццяў. Складанне правіл па прафілактыцы захворванняў і траўм органаў пачуццяў.

### Асабістая гігіена (2 гадзіны)

Выкананне правіл асабістай гігіены – залог захавання і ўмацавання здароўя. Прадметы асабістай гігіены (мыла, зубная паста, зубная шчотка, мачалка, расчоска, насоўка), іх прызначэнне, правілы выкарыстання. Выкананне ранішняга і вячэрняга туалету. Зубы. Догляд поласці рота. Догляд цела (мыццё рук, прыняцце душа, купанне). Паслядоўнасць і самастойнасць дзеянняў па захаванні чысціні цела.

Знешні выгляд вучня. Акуратнасць прычоскі, адзення, абутку. Догляд валасоў. Догляд пазногцяў рук і ног.

Практычная дзейнасць

Складанне і выкананне правіл асабістай гігіены ў школе і дома. Дзеянні па замацаванні прыёмаў выкарыстання прадметаў асабістай гігіены, іх захоўвання; прыёмаў догляду валасоў, пазногцяў; зашпільвання (расшпільвання) гузікаў. Практыкаванне ў ацэньванні знешняга выгляду (свайго, аднакласнікаў, дарослых).

Рэжым дня (2 гадзіны)

Рэжым дня, неабходнасць яго выканання для ўмацавання здароўя вучня. Пастава правільная і няправільная. Значэнне правільнай пасадкі, фізічных практыкаванняў у фарміраванні правільнай паставы. Актыўны адпачынак дзіцяці (ранішняя гімнастыка, заняткі спортам, гульні на свежым паветры і іншае), яго чаргаванне з разумовай нагрузкай (падрыхтоўкай урокаў і іншай).

Практычная дзейнасць

Складанне рэжыму дня, выкананне патрабаванняў да прагляду тэлеперадач і работы за камп’ютарам. Выкананне практыкаванняў ранішняй гімнастыкі.

Прафілактыка захворванняў (2 гадзіны)

Эпідэмія. Проціэпідэмічныя мерапрыемствы.

Прастудныя захворванні, траўмы, іх прыметы, прычыны і прафілактыка. Фактары, шкодныя для здароўя, уменні іх распазнаваць і пазбягаць.

Значэнне для здароўя чалавека правільнага харчавання, фізічнай нагрузкі, чысціні, рэгулярнага праветрывання памяшкання.

Практычная дзейнасць

Складанне спісу проціэпідэмічных мерапрыемстваў.

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

пра сябе (свае імя, прозвішча, узрост, палавую ідэнтыфікацыю);

склад і абавязкі членаў сваёй сям’і;

вучэбныя прылады, якія штодня выкарыстоўваюцца, побытавыя прадметы, іх прызначэнне і спосабы выкарыстання;

клас, школу, прышкольны ўчастак, прафесіі людзей, якія працуюць у школе;

горад (вёску) і краіну пражывання, іх славутасці;

агародніну, садавіну, кветкі, дрэвы, кусты, травяністыя расліны (асаблівасці знешняга выгляду);

жывёл і іх дзіцянят (2–3 на выбар);

аб’екты нежывой прыроды і прыродныя з’явы;

поры года;

часткі цела чалавека;

рэжым дня школьніка;

правілы культурных паводзін у сталовай, кінатэатры і іншых месцах грамадскага карыстання.

У вучняў сфарміраваны ўменні:

адказваць на пытанні пра сябе, сваю сям'ю, называць імёны членаў сям'і;

вітацца, развітвацца, дзякаваць за паслугу, прасіць прабачэння, звяртацца па дапамогу да дарослых і равеснікаў;

культурна паводзіць сябе дома, у школе, грамадскіх месцах, транспарце;

арыентавацца ў кватэры, класе, памяшканнях школы;

адрозніваць агародніну і садавіну па форме, колеры, смаку, паху, велічыні;

вызначаць прыметы прадметаў з дапамогай органаў пачуццяў;

прымяняць цацкі, вучэбныя прылады, адзенне, абутак, посуд па прызначэнні, раскладваць па месцах;

выконваць абавязкі дзяжурнага;

прымаць удзел у сервіроўцы стала да абеду, уборцы посуду, доглядзе адзення і абутку;

паказваць і называць часткі цела;

выконваць правілы асабістай гігіены, выкарыстоўваць прадметы гігіены пры ранішнім і вячэрнім туалеце, раскладваць прадметы па месцах;

выконваць рэжым дня, патрабаванні да прагляду тэлеперадач і рабоце за камп'ютарам;

арыентавацца ў часе, выкарыстоўваць словы, якія характарызуюць часавыя ўзаемаадносіны.

Вучні ведаюць і прымяняюць у розных відах дзейнасці:

называюць свае прозвішча і імя ў розных сітуацыях;

арыентуюцца ў школьных памяшканнях, школьным двары, на спартыўнай пляцоўцы;

знаходзяць сваё працоўнае месца ў класе; рыхтуюцца да ўрокаў, выбіраюць адпаведныя вучэбныя прылады;

назіраюць за надвор'ем і сезоннымі зменамі ў прыродзе;

адрозніваюць у прыродзе і на малюнках найбольш распаўсюджаных прадстаўнікоў раслінннага і жывёльнага светаў;

назіраюць за жывёламі (звычкамі катоў і сабак), птушкамі (дзе жывуць, чым харчуюцца, карысць ці шкоду прыносяць чалавеку);

называюць і паказваюць 3–4 віды свойскай, дзікай жывёлы, зімуючых (пералётных) птушак, насякомых;

удзельнічаюць у зборы прыроднага матэрыялу;

выбіраюць адзенне ў адпаведнасці з парой года;

даглядаюць пакаёвыя расліны: паліваюць, рыхляць глебу, праціраюць пыл на буйным лісці;

выконваюць простыя сезонныя работы ў агародзе.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

прадметныя ўяўленні (веды) і ўменні ў навучальных і натуральных сітуацыях (адбіраюць ядомае ад неядомага; прыдумляюць простыя рэцэпты салатаў з агародніны і садавіны; выбіраюць агародніну (садавіну) для прыгатавання салата);

прадметныя ўяўленні (веды) і ўменні ў гульнях-драматызацыях, інсцэніроўках («Пачастуй сябра», «Павіншуй сябра з днём нараджэння»), доследнай дзейнасці («Брудная і чыстая агародніна», «Чаму завяла кветка», «У пакоі вельмі душна: што рабіць?»).

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

ветліва звяртаюцца да настаўніка і аднакласнікаў, выкарыстоўваюць словы падзякі;

праяўляюць клапатлівае стаўленне да членаў сям'і (аказваюць дапамогу па доме, дапамагаюць пры недамаганні);

клапоцяцца пра птушак, свойскую жывёлу;

выконваюць правілы паводзін у грамадскіх месцах;

наводзяць парадак у класе і дома;

сервіруюць стол.

## III КЛАС
## (70 гадзін)
## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (30 гадзін)

### Я і людзі вакол (2 гадзіны)

Звесткі пра сябе. Жаданні, захапленні, магчымасці, перажыванні, любімыя заняткі ў школе і дома.

Правілы культурных паводзін з дарослымі і дзецьмі, якія знаходзяцца побач. Добрыя і дрэнныя ўчынкі людзей. Правілы паводзін у гасцях. Культура паводзін за сталом.

Практычная дзейнасць

Называнне сваіх імя (поўнага і кароткага), імя па бацьку, прозвішча, указанне ўзросту, полу. Апісанне спосабаў праяўлення добразычлівага стаўлення да аднакласнікаў. Дэманстрацыя дзеянняў па аказанні дапамогі малодшаму, хвораму, пажылому чалавеку ў розных сітуацыях (малыш упаў, дзядуля захварэў). Дэманстрацыя спосабаў праяўлення ветлівасці ў зносінах, віншаванні са святамі.

### Мая сям'я (2 гадзіны)

Мая сям'я. Сямейныя традыцыі. Вольны час членаў сям'і. Любімы занятак дома. Працоўная дзейнасць бацькоў, іх прафесія, месца работы.

Наша кватэра, колькасць пакояў, іх прызначэнне. Стварэнне ўтульнасці і падтрыманне парадку ў кватэры.

Практычная дзейнасць

Пазнаванне прафесіі па атрыбутыцы і працоўных дзеяннях чалавека. Называнне месца работы і прафесіі бацькоў. Удзел у сумеснай дзейнасці па падтрыманні парадку ў кватэры, уборцы (праветрыванне, навядзенне парадку ў шафах з адзеннем, кнігамі і цацкамі, паліў кветак, выціранне пылу, чыстка дываноў з дапамогай пыласоса, вільготнае прыбіранне).

Мой клас (2 гадзіны)

Наш дружны клас. Сяброўскія адносіны. Правілы паводзін у класе.

Вучоба – галоўны абавязак вучняў. Расклад урокаў, самастойная падрыхтоўка да ўрока, выбар пэўных вучэбных прылад. Любімы ўрок. Акуратнае і неакуратнае працоўнае месца. Правілы паводзін на ўроку і на перапынку.

Практычная дзейнасць

Выбар вучэбных прылад для кожнага ўрока, акуратнае раскладванне на стале. Аказанне адно аднаму дапамогі ў вучобе, працы, розных штодзённых сітуацыях. Выкананне абавязкаў вучняў. Сумесная падрыхтоўка і правядзенне святаў. Аналіз поспехаў і няўдач адно аднаго.

Мая школа (2 гадзіны)

Школьны будынак, нумар і адрас школы. Арыентаванне ў школьным будынку, прызначэнне і размяшчэнне памяшканняў, іх прадметнае напаўненне. Беражлівае стаўленне да школьнай маёмасці, падтрыманне чысціні і парадку. Прышкольны ўчастак. Назвы і прызначэнні школьных пабудоў. Бліжэйшыя да школы ўстановы (арганізацыі) сацыяльна-культурнага прызначэння.

Прафесіі работнікаў школы, іх узаемадзеянне, змест і вынік іх працы. Паважлівае стаўленне да работнікаў школы.

Практычная дзейнасць

Экскурсія па школе. Складанне планаў класа, школы. Прасторавае арыентаванне ў школьным будынку. Складанне і выкананне правіл школьніка. Ацэньванне сваіх паводзін і паводзін аднакласнікаў. Складанне правіл узаемадзеяння з работнікамі школы ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях, дэманстрацыя асобных дзеянняў.

Прадметы вакол мяне (14 гадзін)

Посуд для прыгатавання і ўжывання ежы. Правілы карыстання сталовымі прыборамі. Сервіроўка і прыбіранне стала. Акуратнае выкарыстанне посуду.

Прадукты харчавання. Малочныя, мясныя, мучныя прадукты.

Разнастайнасць страў. Снеданне, абед, вячэра. Беражлівае стаўленне да прадуктаў харчавання.

Бытавая тэхніка (халадзільнік, чайнік, тэлевізар, прас, пыласос). Прызначэнне, правілы выкарыстання, бяспечнага абыходжання.

Адзенне (жаночае, мужчынскае, штодзённае, святочнае, спартыўнае). Назвы адзення і яго частак, іх прызначэнне. Абутак (чаравікі, туфлі, боты). Выбар адзення і абутку ў залежнасці ад прызначэння, прыналежнасці (дзіцячае, мужчынскае, жаночае), пары года. Догляд адзення і абутку.

Мэбля, яе прызначэнне, размяшчэнне ў класе, кватэры. Догляд мэблі.

Пасцельныя прыналежнасці (прасціна, навалачка, падкоўдранік). Паслядоўнасць рассцілання/засцілання пасцелі.

Прадметы асабістага (адзенне, абутак, прадметы гігіены і іншыя) і грамадскага карыстання (кнігі, цацкі, прылады працы), правілы іх выкарыстання, беражлівага стаўлення.

Практычная дзейнасць

Разгляданне рукатворных прадметаў. Вызначэнне іх прызначэння, уласцівасцей і якасцей. Вылучэнне і называнне частак і дэталей адзення, абутку. Параўнанне і групаванне прадметаў адзення, абутку па сезоне, прызначэнні, матэрыяле. Класіфікацыя прадметаў па істотных прыметах. Практыкаванні ў доглядзе адзення, абутку. Рассціланне/засціланне пасцелі.

Горад і сяло (2 гадзіны)

Мой родны горад (пасёлак, сельскі населены пункт). Вуліцы горада (пасёлка, сельскага населенага пункта). Назвы вуліц і нумарацыя дамоў. Гарадскі і сельскі дамы, іх падабенства і адрозненні. Матэрыял, з якога будуюць дамы (цэгла, дрэва). Колькасць насельніцтва ў горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце). Праца і прафесіі людзей у горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце).

Практычная дзейнасць

Экскурсіі, мэтавыя прагулкі па горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце). Называнне свайго хатняга адраса, вуліцы, на якой размешчана школа. Вызначэнне матэрыялу, з якога будуюць дамы. Назіранні за працай людзей. Параўнанне горада, пасёлка і сельскага населенага пункта па фатаграфіях і ілюстрацыях. Рашэнне праблемных сітуацый тыпу: «Што было б, калі б усе людзі перасталі працаваць?».

Правілы дарожнага руху (4 гадзіны)

Дарога, яе часткі. Правілы дарожнага руху. Пешаходы, пасажыры. Віды транспарту: наземны, падземны, водны і паветраны. Транспарт пасажырскі, грузавы і спецыяльнага прызначэння. Сігналы святлафора і

рэгуліроўшчыка. Правілы паводзін у транспарце (уваход і выхад, набыццё білетаў, месцы для інвалідаў і пажылых людзей, пасажыраў з дзецьмі).

Практычная дзейнасць

Распазнаванне частак дарогі. Класіфікацыя відаў транспарту па прызначэнні, спосабе перамяшчэння. Арыентаванне на дарозе па колеравых сігналах святлафора. Адпрацоўка правіл паводзін у сюжэтна-ролевых гульнях «На вуліцы», «У транспарце».

Мая краіна (2 гадзіны)

Наша Радзіма – Рэспубліка Беларусь. Беларусь – краіна блакітных азёр і рэк, зялёных лясоў. Мінск – сталіца Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная сімволіка. Насельніцтва Беларусі. Беларускае нацыянальнае адзенне. Прадметы і колеры нацыянальнага касцюма. Нацыянальны арнамент.

Практычная дзейнасць

Экскурсіі, мэтавыя прагулкі па горадзе (пасёлку, сельскім населеным пункце). Прагляд і абмеркаванне відэафільмаў аб роднай краіне. Распазнаванне сцяга, герба, гімна, нацыянальнага арнаменту.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК» (30 гадзін)

Прырода вакол нас (2 гадзіны)

Аб’екты нежывой прыроды: вада, паветра, глеба, іх уласцівасці, стан, значэнне ў жыцці чалавека, жывёл і раслін. Прыродаахоўная і разбуральная дзейнасць чалавека.

Часавыя ўяўленні: часткі сутак (раніца, дзень, вечар, ноч), іх паслядоўнасць; дзейнасць людзей у розны час сутак.

Практычная дзейнасць

Мэтавая прагулка на прыроду. Удзел у прыродаахоўных мерапрыемствах «Ахоўваем прыроду разам». Практычныя дзеянні па засваенні правіл бяспечных паводзін на прыродзе. Адрозніванне частак сутак у сувязі з дзейнасцю людзей.

Раслінны свет (12 гадзін)

Дрэвы, кусты, травяністыя расліны. Параўнанне (пошук адрозненняў) па знешнім выглядзе (паўтарэнне).

Кусты (2–3 на выбар), іх адметныя прыметы.

Дрэвы (бяроза, ліпа, клён, таполя, дуб). Агульныя прыметы: корань, ствол, галлё, лісце. Адметныя прыметы: афарбоўка ствала, форма лісця.

Дрэвы саду (3–5 на выбар). Адметныя прыметы: афарбоўка ствала, форма лісця, знешні выгляд пладоў. Асаблівасці догляду садовых дрэў.

Агарод. Агародніна (3–5 на выбар). Агародніна ў харчаванні чалавека, вараная і сырая агародніна. Правілы гігіены пры ўжыванні агародніны.

Расліны лугу, поля, парку, іх значэнне ў жыцці чалавека.

Прышкольны ўчастак. Віды дзейнасці на прышкольным участку: ускопванне, баранаванне, рыхленне глебы, пасадка, паліў, праполка раслін. Газоны і кусты вакол школы, іх прызначэнне. Беражлівае стаўленне да раслін (нельга вытоптваць газоны, ірваць лісце, ламаць галінкі).

Кветнік (цяпліца). Прызначэнне. Расліны кветніка (цюльпаны, нарцысы, астры і іншыя). Назіранні за кветнікам вясной, летам, восенню. Змены ў жыцці раслін. Збор пладоў і насення раслін кветніка, умовы захоўвання насення (сухое месца, доступ паветра).

Практычная дзейнасць

Назіранні ў прыродзе. Вызначэнне (распазнаванне, паказванне, называнне) частак расліны, складанне расліны з частак. Распазнаванне дрэў у прыродзе, параўнанне лісця, галінак, шышак (сасны і елкі). Вылучэнне істотных прымет ліставых, хвойных дрэў. Пазнаванне агародніны, садавіны, ягад навобмацак, па смаку, паху. Класіфікацыя, абагульненне, канкрэтызацыя: дрэвы – ліставыя, хвойныя (кусты, расліны кветніка і гэтак далей). Удзел у сезонных работах па вырошчванні раслін.

Жывёльны свет (12 гадзін)

Свойская і дзікая жывёла, яе дзіцяняты. Знешні выгляд, лад жыцця, месца пражывання, харчаванне, звычкі, спосабы перамяшчэння (4–6 на выбар). Умовы, неабходныя для жыцця жывёлы.

Дзікая і свойская птушка (3–5 на выбар). Пералётныя і зімуючыя птушкі, падабенства і адрозненні іх ладу жыцця. Карысць ад птушак. Догляд свойскай птушкі. Клопат людзей аб дзікіх птушках.

Насякомыя (муха, жук, страказа, пчала, матылёк, камар). Асаблівасці знешняга выгляду, адметныя прыметы, прыгажосць і непаўторнасць кожнага.

Рыбы (карась, шчупак, лешч). Будова цела, месцы пражывання, значэнне ў жыцці чалавека. Акварыум, яго насельнікі.

Прыметы жывых арганізмаў: дыхаюць, харчуюцца, размнажаюцца, растуць. Умовы пражывання: паветра, ежа, святло, цяпло.

Чалавек – частка прыроды. Узаемадзеянне чалавека з прыродай.

Практычная дзейнасць

Распазнаванне жывёл у прыродным асяроддзі. Аналіз знешняй будовы жывёліны. Вылучэнне істотных прымет (свойскай і дзікай жывёлы, птушак і іншых). Параўнанне жывёл па знешняй будове, звычках, спосабе харчавання, галасах. Групаванне і класіфікацыя,

абагульненне, канкрэтызацыя (жывёла свойская і дзікая). Рашэнне праблемных сітуацый тыпу: «Што было б у прыродзе, калі б раптам зніклі ўсе птушкі (насякомыя)?».

Поры года (4 гадзіны)

Восень. Ранняя, залатая, позняя восень. Восеньскія месяцы: верасень, кастрычнік, лістапад.

Змены ў нежывой прыродзе восенню ў параўнанні з летам: змяншэнне працягласці дня, зніжэнне тэмпературы паветра, ахаладжэнне вады і глебы; змяненне стану неба і віду ападкаў (асаблівасці восеньскіх дажджоў, выпадзенне першага снегу).

Расліны восенню. Уплыў змен у нежывой прыродзе на жыццё раслін. Паспяванне пладоў і насення розных раслін. Расліны саду і агарода, у якіх восенню паспяваюць ядомыя плады. Завяданне і засыханне травяністых раслін. Змяненне афарбоўкі лісця дрэў і кустоў. Лістапад.

Жыццё жывёл восенню. Змяншэнне колькасці насякомых. Пералёты птушак. Падрыхтоўка зімовага жылля і нарыхтоўка корму. Лінька, змяненне гушчыні і афарбоўкі шэрсці ў звяроў. Заляганне ў спячку (мядзведзь, вожык).

Праца людзей восенню. Восеньскія работы ў палях, агародах, садах, парках: збор і нарыхтоўка на зіму ўраджаю агародніны і садавіны, грыбоў, насення; перакопванне глебы; зграбанне апалага лісця. Клопат чалавека аб свойскай жывёле (нарыхтоўка кармоў, падрыхтоўка да халадоў памяшканняў для жывёл). Дапамога дзяцей у доглядзе за свойскай жывёлай.

Адзенне і абутак па сезоне. Выбар адзення, абутку, атрыбутаў (парасон) адпаведна надвор’ю. Як правільна апранацца восенню.

Восеньскія забавы дзяцей. Збор восеньскага лісця, пладоў (жалудоў, каштанаў, арэхаў), складанне з іх кампазіцый, вырабаў. Восеньскія прагулкі на свежым паветры, іх уплыў на здароўе і настрой чалавека.

Зіма. Зімовыя месяцы года: снежань, студзень, люты.

Змены ў нежывой прыродзе зімой у параўнанні з восенню: працягласць дня і ночы, прамярзанне глебы; змяненне віду ападкаў. Снег, лёд, снегапад, завіруха. Правілы паводзін у снегапад, падчас галалёду, пры катанні на каньках, лыжах, санках.

Расліны зімой. Травяністыя расліны пад снегам. Хвойныя і ліставыя дрэвы зімой. Вызначэнне дрэў па пладах, якія засталіся, шышках (хвойныя дрэвы).

Жыццё жывёл зімой. Прычыны залягання некаторых жывёл у спячку. Жыццё насякомых, рыб, жаб, змей зімой. Змяненні ў жыцці

лясных звяроў (вавёрка, заяц, воўк, ліса, лось, мядзведзь, вожык). Дапамога людзей дзікім жывёлам у зімовы час.

Змяненне ўмоў і ладу жыцця свойскай жывёлы з надыходам зімы. Клопат людзей аб свойскай жывёле.

Праца людзей зімой: уборка снегу на вуліцах, пасыпанне слізкіх дарог пяском, соллю; падкормліванне птушак, выраб кармушак.

Адзенне і абутак па сезоне. Выбар адзення па надвор'і, сітуацыі; паслядоўнасць апранання (распранання).

Зімовыя гульні і забавы дзяцей. Катанне на санках, лыжах, каньках. Лепка і кіданне снежак. Святкаванне Новага года. Атрыбутыка свята, сумесная падрыхтоўка да святкавання. Навагоднія віншаванні равеснікаў і дарослых.

Вясна. Вясновыя месяцы, іх паслядоўнасць: сакавік, красавік, май.

Змены ў нежывой прыродзе вясной у параўнанні з зімой: працягласць дня і ночы, пацяпленне. Раставанне снегу, крыгаход, вясновы разліў рэк, праграванне і прасыханне глебы. Вясновыя навальніцы.

Расліны вясной. Абуджэнне раслін: набраканне пупышак, распусканне лісця, цвіценне дрэў і кустоў. Раннеквітнеючыя травяністыя расліны роднага краю (медуніца, фіялка, падбел). Неабходнасць беражлівага стаўлення да вясновых першацветаў.

Жыццё жывёл вясной. Вылет чмялёў, пчол, з'яўленне матылькоў, мурашак. Прылёт і гнездаванне птушак. Вывядзенне птушанят. Залежнасць тэрміну прылёту птушак ад наяўнасці корму. Беражлівае стаўленне чалавека да птушак у веснавую пару года. Змены ў жыцці звяроў, жаб, змей, яшчарак вясной.

Праца людзей вясной. Вясновыя работы на прышкольным участку, у садах: абкопванне дрэў і кустоў, аранне зямлі, пасеў насення, пасадка бульбы, бяленне ствалоў дрэў.

Адзенне і абутак па сезоне: куртка, плашч, шапка, гумавыя боты.

Вясновыя забавы дзяцей: выраб і пусканне караблікаў. Правілы паводзін ля вадаёмаў вясной. Падрыхтоўка да святкавання 8 Сакавіка. Віншаванне мам, бабуль, сясцёр, аднакласніц.

Лета. Летнія месяцы года, іх паслядоўнасць: чэрвень, ліпень, жнівень.

Змены ў нежывой прыродзе: працягласць дня і ночы. Лета – самая цёплая пара года. Праграванне паветра, вады, глебы. Летнія дажджы, навальніцы.

Расліны летам. Цвіценне траў, паспяванне ягад, агародніны.

Жыццё жывёл летам. Звычкі дзікіх звяроў, птушак, іх клопат аб патомстве. Правілы паводзін у лесе, пры сустрэчы са звярамі, птушкамі, насякомымі.

Праца людзей летам: праполка, паліў раслін, збор агародніны, грыбоў і ягад.

Адзенне і абутак па сезоне: сукенка, спадніца, шорты, майка, басаножкі. Галаўны ўбор: панама, кепка, хустка. Правілы паводзін у спякотнае надвор’е.

Летнія забавы дзяцей: загаранне і купанне. Правілы прыёму сонечных і паветраных ваннаў. Правілы паводзін у вадзе, лесе, на лузе, ля вадаёмаў, падчас навальніцы, пры сустрэчы з пчоламі, восамі, змеямі.

Практычная дзейнасць

Назіранні ў прыродзе. Вылучэнне істотных прымет пары года пры непасрэдным успрыманні і на ілюстрацыях. Выбар адзення, абутку, атрыбутаў з улікам сезонных умоў надвор’я. Работа з календаром прыроды. Выкананне сезонных работ на прышкольным участку і догляд раслін (пасадка, паліў, праполка, уборка ўраджаю). Выраб і пусканне караблікаў.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (10 гадзін)

### Часткі цела чалавека (4 гадзіны)

Часткі твару, іх функцыі. Органы пачуццяў, іх значэнне ў пазнаванні навакольнага свету. Часткі тулава чалавека (спіна, грудзі, жывот). Назвы пальцаў рук.

Пастава, яе фарміраванне ў дзіцячым узросце. Значэнне правільнай пасадкі і гімнастыкі для фарміравання паставы.

Практычная дзейнасць

Аналіз знешняй будовы цела чалавека, вызначэнне прымет прадметаў з дапамогай органаў пачуццяў. Паказванне і называнне частак твару (лоб, шчокі, нос, губы, вочы, бровы, вейкі), пальцаў рук. Выкананне комплексу практыкаванняў (3–4) для правільнай паставы.

### Гігіена цела (4 гадзіны)

Догляд цела: валасоў, скуры, пазногцяў. Рэгулярнасць і значэнне гігіенічных працэдур на працягу дня.

Прадметы асабістай гігіены для ранішняга і вячэрняга туалету: знешні выгляд, месцазнаходжанне. Паслядоўнасць выканання правіл асабістай гігіены. Ацэнка знешняга выгляду.

Рэжым дня. Ранішняя гімнастыка.

Правільнае харчаванне чалавека. Прафілактыка харчовых атручэнняў. Гігіена месца для ўжывання ежы. Сталовая. Правілы паводзін за сталом. Эстэтыка ўжывання ежы. Беражлівае стаўленне да хлеба. Шкоднасць ужывання сухой ежы і пераядання.

Гігіена адзення і абутку. Змена адзення і абутку, праветрыванне, сушка, падтрыманне чысціні.

Гігіена памяшкання. Значэнне чысціні ў памяшканнях, вільготнае прыбіранне. Шкоднасць пылу ў памяшканнях. Паветраны рэжым у класным і спальным пакоях. Скразнякі, іх небяспека для здароўя. Меры засцярогі.

Практычная дзейнасць

Практычныя дзеянні па доглядзе цела з выкарыстаннем прадметаў асабістай гігіены. Практычныя дзеянні па доглядзе адзення і абутку. Складанне правіл падтрыманні чысціні ў памяшканнях, дэманстрацыя дзеянняў.

Прафілактыка захворванняў (2 гадзіны)

Неабходнасць і своечасовасць звароту па медыцынскую дапамогу ў выпадку недамагання. Хатняя аптэчка, яе прызначэнне, месцазнаходжанне. Догляд хворага члена сям'і.

Папярэджванне захворванняў і траўм. Фактары, шкодныя для здароўя, уменне іх распазнаваць і пазбягаць.

Практычная дзейнасць

Сюжэтна-ролевыя гульні «Бабуля захварэла», «Збяром хатнюю аптэчку». Рашэнне праблемных сітуацый тыпу: «Што б ты рабіў у выпадку прастуды?».

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

пра сябе (свае імя, прозвішча, узрост, палавую ідэнтыфікацыю);

склад сям'і, абавязкі членаў сваёй сям'і, месцы працы і прафесіі бацькоў;

клас, школу, прышкольны ўчастак, прафесіі работнікаў школы;

вывучаныя прадметы і з'явы, аб'екты жывой і нежывой прыроды, іх прыналежнасць да пэўнай групы;

жывёл і іх дзіцянят: месцы пражывання, спосабы харчавання, перамяшчэння; значэнне ў жыцці чалавека;

аб'екты нежывой прыроды і прыродныя з'явы, значэнне вады, цяпла, святла ў жыцці раслін і жывёл;

прыметы пор года, узаемасувязі паміж сезонам і зменамі ў жыцці чалавека, раслін, жывёл;

рэжым дня школьніка;

правілы культурных паводзін у сталовай, кінатэатры і іншых месцах грамадскага карыстання;

горад і краіну пражывання, іх славутасці;

дзяржаўную сімволіку;

віды транспарту, яго прызначэнне, сігналы святлафора.

Уменні:

адказваць на пытанні пра сябе, сваю сям’ю, называць імёны членаў сям’і;

вітацца, развітвацца, дзякаваць за паслугу, прасіць прабачэння, звяртацца па дапамогу да дарослых і равеснікаў;

арыентавацца ў кватэры, школьным будынку, школьным двары;

звяртацца да настаўнікаў па імені і імені па бацьку;

выконваць абавязкі дзяжурнага;

адрозніваць колеры, формы, памеры прадметаў;

сервіраваць стол да абеду, прыбіраць посуд;

выбіраць адзенне, абутак па сезоне, самастойна апранацца, распранацца, даглядаць адзенне, абутак;

выконваць правілы асабістай гігіены, выкарыстоўваць прадметы гігіены пры ранішнім і вячэрнім туалеце, раскладваць іх па месцах;

называць віды транспарту, выконваць правілы пасажыра і пешахода;

адрозніваць аб’екты жывой і нежывой прыроды;

паказваць і называць найбольш распаўсюджаныя ў пэўнай мясцовасці расліны, жывёл, вызначаць іх значэнне ў жыцці чалавека;

расказваць пра лад жыцця і звычкі дзікай і свойскай жывёлы, птушак.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

самастойна арыентуюцца ў школьных памяшканнях, школьным двары, на спартыўнай пляцоўцы;

знаходзяць сваё працоўнае месца ў класе, рыхтуюцца да ўрокаў, выбіраюць адпаведныя вучэбныя прылады;

выконваюць рэжым дня школьніка;

даглядаюць пакаёвыя расліны;

адрозніваюць у прыродзе і на малюнках найбольш распаўсюджаных прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага светаў;

удзельнічаюць у зборы прыроднага матэрыялу;

выбіраюць адзенне ў адпаведнасці з парой года;

пазнаюць і называюць асноўныя прадметы мэблі, посуду, бытавыя прыборы, выкарыстоўваюць іх па прызначэнні;

назіраюць за жывёламі (звычкамі катоў, сабак), птушкамі (дзе жывуць, чым харчуюцца, карысць ці шкоду прыносяць чалавеку);

выконваюць простыя сезонныя работы ў агародзе.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

прадметныя ўяўленні (веды) і ўменні ў натуральных сітуацыях жыццядзейнасці; гульнях-драматызацыях, інсцэніроўках («Я спазніўся на ўрок», «Я заблудзіўся», «Сустракаем гасцей у школе», «Што падарыць сябру», «Я дрэнна сябе адчуваю»), доследнай дзейнасці (вызначэнне

спеласці садавіны, яе прыдатнасці да ўжывання у ежу па асаблівасцях знешняга выгляду);

адлюстроўваюць у вучэбнай і прадуктыўнай дзейнасці сувязі і залежнасці, даступныя назіранню і свайму разуменню (напрыклад, восенню дзень становіцца карацейшым, змяншаецца колькасць сонечнага святла і цяпла, становіцца халадней; становіцца халадней – астываюць глеба, вада ў рэках і азёрах; астывае глеба – спыняецца рост і развіццё раслін, завядае трава, ападае лісце з дрэў і кустоў).

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

культурна камунікуюць з сябрамі, аднакласнікамі, работнікамі школы;

выкарыстоўваюць ветлівыя словы ў розных сітуацыях (падчас прывітання дарослых і равеснікаў, развітання, выказвання падзякі, просьбы, выбачэння за клопат, дапушчаную няёмкасць або зроблены праступак і іншых);

выконваюць правілы паводзін у грамадскіх месцах, транспарце;

клапатліва і паважліва ставяцца да членаў сваёй сям'і, старанна выконваюць свае хатнія абавязкі.

## IV КЛАС
## (70 гадзін)
## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (28 гадзін)

### Я і людзі вакол (4 гадзіны)

Анкетныя даныя пра сябе: прозвішча, імя (кароткае і поўнае), імя па бацьку, пол, узрост, адрас.

Сяброўства. Што значыць сябраваць. Каго можна лічыць сябрам. Мае сябры, іх імёны, узрост, пол, месцапражыванне, захапленні. Правілы зносін. Добрыя і дрэнныя ўчынкі сяброў. Мая дапамога сябру.

Мае суседзі. Імёны (імёны па бацьку) суседзяў. Уважлівае і паважлівае стаўленне да суседзяў. Правілы ветлівых зносін з суседзямі. Дапамога адзінокім, хворым, пажылым суседзям. Правілы сумеснага пражывання (падтрыманне чысціні на лесвічнай пляцоўцы, у пад'ездзе, захаванне цішыні). Меры засцярогі пры сустрэчы і размове з незнаёмымі дарослымі. Канфліктныя сітуацыі, іх папярэджванне і вырашэнне.

Практычная дзейнасць

Адпрацоўка правіл паводзін у грамадстве: уменняў уступаць у дыялог (з равеснікам, дарослым), падтрымліваць і завяршаць яго (улічваць умовы і сітуацыю зносін; звяртацца па імені, слухаць і чуць суразмоўцу, пытацца, адказваць); прытрымлівацца маўленчага этыкету ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях: пры звароце, знаёмстве, прывітанні, прыцягненні ўвагі, запрашэнні, просьбе, згодзе і адмове, прабачэнні, скарзе, спагадзе, віншаванні, падзяцы, развітанні і ў іншых

сітуацыях; уменняў мецць зносіны ў пары, у калектыве для планавання сумесных дзеянняў, абмеркавання вынікаў. Дэманстрацыя спосабаў невербальнай камунікацыі.

Прадметы вакол мяне (8 гадзін)

Посуд для прыгатавання і ўжывання ежы. Правілы карыстання сталовымі прыборамі.

Прадукты харчавання: малочныя, мясныя, хлебабулачныя вырабы, іх характэрныя прыметы. Любімыя стравы, іх інгрэдыенты. Бяспека харчавання. Дабраякасныя і няякасныя прадукты (гнілыя, з цвіллю). Беражлівае стаўленне да прадуктаў харчавання.

Бытавая тэхніка: кухонная (чайнік, халадзільнік), для вольнага часу (тэлевізар), для падтрымання парадку (пыласос, прас). Прызначэнне, тэхніка бяспекі пры выкарыстанні.

Адзенне, абутак, іх прызначэнне і разнастайнасць. Віды адзення і абутку: для вучэбных заняткаў, працы, спорту, святаў.

Мэбля, яе прызначэнне. Пасцельныя прыналежнасці, паслядоўнасць засцілання ложка.

Вытворчасць прадукцыі на фабрыках, заводах. Матэрыял, з якога выраблены прадметы: шкло, метал, скура, гума, дрэва, папера. Уласцівасці і якасці розных матэрыялаў. Прафесіі людзей, прылады працы (інструменты), неабходныя для работы. Рамонт рукатворных прадметаў у атэлье, майстэрні (гадзіннікавай, абутковай, сталярнай).

Практычная дзейнасць

Сервіроўка і прыбіранне стала. Групаванне прадуктаў харчавання, вызначэнне іх якасці. Раскладванне прадуктаў харчавання для захоўвання. Выбар адзення з улікам пары года, надвор'я, сітуацыі. Адпрацоўка паслядоўнасці апранання, распранання, спосабаў зашпільвання і расшпільвання прадметаў адзення і абутку. Складанне правіл догляду адзення і абутку. Дэманстрацыя спосабаў беражлівага стаўлення да адзення і абутку.

Праца людзей (4 гадзіны)

Праца людзей у горадзе і вёсцы. Змест і вынікі працы, працоўныя дзеянні. Месцы работы людзей у горадзе: фабрыкі, заводы, установы культурнага і сацыяльна-бытавога прызначэння. Прафесіі людзей у вёсцы: аграном, жывёлавод і іншыя. Месцы работы і прафесіі бацькоў.

Мая краіна (4 гадзіны)

Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь (герб, сцяг, гімн), мова. Народныя традыцыі і святы: Каляды, Вялікдзень, Масленіца, Купалле, Дажынкі, абрад «Гуканне вясны» і іншыя.

Сталіца Рэспублікі Беларусь – горад Мінск. Буйныя гарады Беларусі. Прадпрыемствы, прадукцыя, якая вырабляецца на іх.

Народныя мастацкія рамёствы: саломапляценне, ткацтва, вышыўка. Выказванне ўласнага стаўлення да прадметаў, створаных рукамі чалавека.

Беларусь – край лясоў і азёр. Буйныя азёры і рэкі Беларусі.

Практычная дзейнасць

Называнне сталіцы Рэспублікі Беларусь. Экскурсіі па родным горадзе, на мясцовыя прадпрыемствы. Расказы пра славутасці з апорай на ілюстрацыі, фатаграфіі. Разгляданне прадметаў, створаных рукамі чалавека з саломы, гліны, лёну. Удзел у выставе вырабаў народнага рамяства. Гульня-падарожжа «Па гарадах нашай Радзімы». Называнне буйных рэк і азёр. Чытанне апавяданняў, казак, прымавак, праслухванне песень на беларускай мове.

Мой горад (пасёлак, сельскі населены пункт) (4 гадзіны)

Гарады вялікія і маленькія. Родны горад (пасёлак, сельскі населены пункт). Галоўная вуліца, плошча. Прыгожыя месцы і будынкі, іх назвы і прызначэнне. Шматпавярховыя і аднапавярховыя дамы. Матэрыял, з якога пабудаваны дамы (цэгла, дрэва, жалезабетон).

Адрозненні горада ад пасёлка, сельскага населенага пункта: колькасць насельніцтва, знешні выгляд дамоў, установы, праца і прафесіі людзей. Установы горада (пасёлка, сельскага населенага пункта), іх месцазнаходжанне. Наяўнасць апазнавальных слоў-назваў, графічных сімвалаў, піктаграм. Магазіны: прадуктовыя, гаспадарчыя, мэблевыя і іншыя, аптэкі. Вольны час выхаднога дня.

Транспарт, яго прызначэнне. Транспарт пасажырскі, грузавы, спецыяльнага прызначэння. Віды транспарту: наземны, падземны, водны, паветраны. Адрозненні і падабенства відаў транспарту.

Практычная дзейнасць

Называнне месца пражывання (горада, пасёлка, сельскага населенага пункта), яго славутасцей. Параўнанне дамоў у сельскай і гарадской мясцовасцях (паверхавасць, матэрыял, з якога пабудаваны дамы). Знаходжанне патрэбнага аб’екта па ўмоўных абазначэннях. Адрозніванне відаў транспарту, іх прызначэння.

Правілы дарожнага руху (4 гадзіны)

Правілы дарожнага руху. Часткі дарогі (тратуар, праезная частка). Значэнне святлафора ў руху транспарту і пешаходаў. Дарожныя знакі: «Наземны пешаходны пераход», «Падземны пешаходны пераход», забараняльныя знакі. Рэгуліроўшчык на дарозе. Паводзіны на вуліцы і ў транспарце.

Практычная дзейнасць

Распазнаванне частак дарогі. Выкананне сацыяльных роляў пасажыра і пешахода ў гульнявой дзейнасці. Арыентаванне на дарозе па сігналах святлафора, дарожных знаках.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА» (32 гадзіны)

### Прырода вакол нас (4 гадзіны)

Аб’екты нежывой прыроды. Вада, яе ўласцівасці, стан, спосабы выкарыстання. Правілы бяспекі пры знаходжанні ля вадаёмаў. Ахова водных багаццяў (рэк, азёр, мораў).

Паветра, яго значэнне для жывых арганізмаў. Змяненне тэмпературы паветра (сутачнае, гадавое). Вецер – рух паветра. Ахова паветра ад забруджвання.

Глеба, яе састаў. Роля раслін і жывёл ва ўтварэнні глебы. Урадлівасць – асноўная ўласцівасць глебы. Значэнне глебы ў жыцці чалавека.

Горы і раўніны. Карысныя выкапні (пясок, гліна, камень): уласцівасці, практычнае прымяненне. Прадметы, зробленыя з карысных выкапняў.

Часавыя ўяўленні: часткі сутак, іх паслядоўнасць, суаднясенне з пэўнай дзейнасцю чалавека. Дні тыдня.

Практычная дзейнасць

Вызначэнне аб’ектаў жывой і нежывой прыроды. Адрозніванне (называнне і паказванне) прыродных аб’ектаў і прадметаў, створаных рукамі чалавека. Класіфікацыя, абагульненне, канкрэтызацыя. Вымярэнне тэмпературы паветра. Назіранні за аб’ектамі прыроды. Доследы і практычныя дзеянні з вадой, паветрам. Параўнанне чыстай і бруднай вады. Практычныя дзеянні па эканомным расходаванні вады. Аказанне дапамогі дарослым падчас прыбірання памяшканняў (выціранне пылу, праветрыванне).

### Раслінны свет (14 гадзін)

Жывая прырода – расліны, жывёлы, чалавек. Адрозненні ад нежывой прыроды (рост, дыханне, размнажэнне аб’ектаў жывой прыроды). Умовы росту раслін: вада, глеба, паветра, святло, цяпло.

Дрэвы, кусты, травяністыя расліны. Будова, адметныя асаблівасці знешняга выгляду, значэнне ў жыцці чалавека і жывёлы. Месцы вырастання раслін: лес, парк, сад, агарод. Ліставыя дрэвы (4–5 на выбар). Хвойныя дрэвы.

Садовыя дрэвы і кусты, асаблівасці знешняга выгляду. Плады садовых дрэў і ягадных кустоў. Правілы збору і ўжывання ў ежу садавіны

і ягад. Расліны агарода. Значэнне раслін агарода ў жыцці чалавека. Правілы і спосабы ўжывання агародніны ў ежу.

Грыбы ядомыя і ядавітыя (баравік, лісічка, падасінавік, апенька, мухамор, белая паганка). Правілы збору грыбоў і ўжывання іх у ежу.

Ягады (суніцы, чарніцы, маліны): месцы вырастання, асаблівасці знешняга выгляду, правілы збору, спосаб ужывання ў ежу.

Лекавыя травы, іх значэнне ў жыцці чалавека.

Расліны поля (жыта, пшаніца, кукуруза і іншыя). Праца людзей у палях.

Расліны лугу (рамонак, дзьмухавец, канюшына). Значэнне лугавых траў. Сенакос.

Ядавітыя расліны: воўчая ягада, мудранка і іншыя. Пустазелле, распаўсюджанае ў пэўнай мясцовасці, яго знешні выгляд, адрозненні ад культурных раслін, шкоднае ўздзеянне на іншыя расліны. Спосабы барацьбы з пустазеллем (праполка).

Куток прыроды ў класе (школе). Пакаёвыя расліны. Беражлівае стаўленне да пакаёвых раслін, догляд.

Прышкольны ўчастак. Кветнік, сад, агарод (цяпліца). Арыентаванне на прышкольным участку. Віды дзейнасці на прышкольным участку: ускопванне, баранаванне, рыхленне глебы, пасадка, паліў, праполка раслін. Беражлівае стаўленне да раслін.

Практычная дзейнасць

Адрозніванне раслін найбліжэйшага асяроддзя па знешніх прыметах, лісці, пладах. Распазнаванне ліставых і хвойных дрэў. Класіфікацыя (дрэвы, кусты, травы). Паказванне і называнне частак раслін у прыродзе і на карцінках, мадэліраванне расліны з частак. Практычная работа з гербарнымі ўзорамі. Назіранне за ростам і развіццём расліны ў спецыяльна створаных умовах. Параўнанне агародніны, садавіны па велічыні, колеры, форме, смаку, месцы вырастання. Удзел у пасадцы раслін на прышкольным участку, доглядзе іх, зборы ўраджаю. Перанос ёмістасці з агароднінай і садавіной ва ўстаноўленае месца. Назіранні, доследна-даследчая дзейнасць, якая падводзіць да вызначэння прычынна-выніковых сувязей.

Жывёльны свет (10 гадзін)

Месцы пражывання прадстаўнікоў жывёльнага свету: зямля, паветра, вада. Прыметы жывых арганізмаў: дыхаюць, харчуюцца, размнажаюцца, рухаюцца. Умовы пражывання: паветра, ежа, святло, цяпло.

Дзікая і свойская жывёла: будова цел, характэрныя асаблівасці знешняга выгляду, месцы пражывання, спосабы здабывання ежы.

Свойская жывёла (дваровая і хатняя), яе дзіцяняты. Клопат чалавека аб свойскай жывёле. Значэнне жывёлы ў жыцці чалавека. Дзікія жывёлы, іх дзіцяняты. Умовы існавання свойскай і дзікай жывёлы.

Дзікая і свойская птушка: будова цел, асаблівасці знешняга выгляду. Спевы птушак. Клопат чалавека аб свойскай птушцы. Значэнне свойскай птушкі ў жыцці чалавека. Дзікія птушкі. Зімуючыя птушкі (голуб, верабей, варона, сарока, сініца, дзяцел, снягір). Пералётныя птушкі (бусел, ластаўка, шпак, грак).

Насякомыя (муха, пчала, камар, жук, конік, матылёк): асаблівасці знешняга выгляду, спосабаў перамяшчэння, гукаў, якія яны ўтвараюць. Значэнне насякомых для расліннага і жывёльнага светаў.

Рыбы (карась, карп, шчупак, сом і іншыя): будова цел, афарбоўка, месцы пражывання, значэнне для чалавека.

Непаўторнасць і важнасць кожнага прадстаўніка жывой прыроды. Месца чалавека ў прыродзе. Добрае і дрэннае стаўленне чалавека да прыроды.

Практычная дзейнасць

Вызначэнне ўмоў, неабходных для росту жывых арганізмаў (з апорай на малюнак-схему). Назіранні за свойскай і дзікай жывёлай, зімуючымі птушкамі, рыбамі. Гульні «Назаві і пакажы звяроў (птушак, насякомых, рыб)», «Хто – звер, а хто – птушка», «Хто ведае – далей працягвае», «Хто дзе жыве», «Пачастунак для жывёл». Практыкаванне «Раскажы пра жывёлу» (з апорай на схему). Вылучэнне істотных прымет, групаванне і класіфікацыя аб’ектаў прыроды, якія вывучаюцца. Удзел у доглядзе жывёлы (кармленне рыбак у акварыуме, замена вады і да таго падобнае), у прыродаахоўных мерапрыемствах.

Поры года (4 гадзіны)

Год. Першы дзень новага года – 1 студзеня. Першы дзень новага навучальнага года – 1 верасня.

Паслядоўнасць змены пор года, назвы восеньскіх, зімовых, вясновых, летніх месяцаў. Працягласць дня і ночы ў розныя поры года.

Восень (ранняя, залатая, позняя), зіма, вясна, лета: прыметы кожнай пары года. Змены ў нежывой прыродзе, раслінным, жывёльным светах, жыцці і сезоннай працы людзей. Восеньскія, зімовыя, вясновыя, летнія канікулы: праца, гульні і забавы дзяцей.

Практычная дзейнасць

Адгадванне загадак аб порах года. Экскурсіі на прыроду. Назіранні за небам, сонцам, прадстаўнікамі расліннага і жывёльнага светаў. Вылучэнне прымет пары года пры непасрэдным успрыманні і на ілюстрацыях. Фіксаванне вынікаў назіранняў у календары прыроды. Найпрасцейшыя эксперыменты з аб’ектамі прыроды. Устанаўленне сувязей і залежнасцей у прыродзе, даступных назіранню і разуменню.

Удзел у сезоннай працы дарослых. Складанне гардэробу ў залежнасці ад надвор’я.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (10 гадзін)

### Часткі цела чалавека (2 гадзіны)

Часткі твару і цела чалавека. Эмоцыі чалавека.

Органы пачуццяў. Вочы як орган зроку. Правілы аховы зроку пры чытанні, праглядзе тэлеперадач, рабоце за камп’ютарам. Вушы як орган слыху. Ахова органа слыху. Нос як орган нюху. Язык як орган смаку. Скура як орган дотыку. Пазнанне навакольнага свету з дапамогай органаў пачуццяў. Вызначэнне прымет прадметаў з дапамогай органаў пачуццяў. Прафілактыка захворванняў, траўм органаў пачуццяў.

Практычная дзейнасць

Вызначэнне ўласцівасцей і якасцей прадметаў з дапамогай органаў пачуццяў. Сюжэтна-ролевыя гульні «Выклікаем урача», «Чакаем урача», «У паліклініцы».

### Асабістая гігіена (4 гадзіны)

Прадметы асабістай гігіены (мыла, зубная паста, зубная шчотка, мачалка, расчоска, насоўка). Іх прызначэнне, правілы выкарыстання. Выкананне ранішняга і вячэрняга туалету. Догляд цела, паслядоўнасць выканання дзеянняў па падтрыманні чысціні цела.

Зубы, іх роля ў правільным харчаванні і вымаўленні гукаў. Зубы малочныя і пастаянныя. Правілы захавання здаровых зубоў.

Знешні выгляд. Акуратнасць прычоскі, чысціня рук, пазногцяў, адзення, абутку. Ацэнка знешняга выгляду адно аднаго.

Асабістыя рэчы (адзенне, абутак, прадметы гігіены), неабходнасць іх пастаяннага догляду. Сродкі догляду: шчотка, крэм, губка і іншыя.

Практычная дзейнасць

Практычныя дзеянні па выкананні гігіены харчавання, правіл асабістай гігіены і рэжыму дня. Удзел у сюжэтна-ролевых гульнях «У цырульні», «Збяромся ў госці».

### Рэжым дня (2 гадзіны)

Рэжым дня школьніка, яго значэнне.

Актыўны адпачынак вучняў (заняткі спортам, гульні на свежым паветры і іншае), чаргаванне яго з разумовай нагрузкай (падрыхтоўкай урокаў і іншым).

Практычная дзейнасць

Знаходжанне памылак у рэжыме дня Нязнайкі.

### Прафілактыка захворванняў (2 гадзіны)

Неабходнасць і своечасовасць звароту па медыцынскую дапамогу. Выклік урача паліклінікі, хуткай дапамогі (тэлефон 103). Хатняя аптэчка, яе прызначэнне, месцазнаходжанне; правілы бяспекі пры ўжыванні лякарстваў. Догляд хворага чалавека.

Пастава правільная і няправільная. Значэнне правільнай пасадкі, фізічных практыкаванняў у фарміраванні правільнай паставы. Загартоўванне арганізма. Значэнне чысціні і рэгулярнага праветрывання памяшкання для здароўя чалавека.

Папярэджванне захворванняў і траўм. Фактары, шкодныя для здароўя, уменне іх распазнаваць і пазбягаць.

Практычная дзейнасць

Распазнаванне небяспечных і шкодных для здароўя чалавека фактараў па апісанні сітуацый.

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

пра прадметы побыту, іх будову, прызначэнне, спосабы выкарыстання;

назвы ўрокаў і неабходныя вучэбныя прылады;

прызначэнне і месцазнаходжанне школьных памяшканняў, прафесіі работнікаў школы;

рэжым дня школьніка;

значэнне аб'ектаў жывой і нежывой прыроды ў жыцці чалавека;

жывёл і іх дзіцянят: месцы пражывання, спосабы харчавання, перамяшчэння; значэнне ў жыцці чалавека;

аб'екты нежывой прыроды і прыродныя з'явы; значэнне вады, цяпла, святла ў жыцці раслін і жывёл;

прыметы пор года, узаемасувязі паміж сезонам і зменамі ў жыцці чалавека, раслін, жывёл;

будову цела чалавека, значэнне органаў пачуццяў у пазнанні навакольнага свету;

правілы культурных паводзін у месцах грамадскага карыстання;

горад і краіну пражывання, іх славутасці;

дзяржаўную сімволіку;

часткі дарогі (тратуар, праезная частка), віды транспарту, іх прызначэнне;

правілы бяспечных паводзін на дарозе.

Уменні:

адказваць на пытанні пра сябе, сваю сям'ю, называць імёны членаў сям'і;

вітацца, развітвацца, дзякаваць за паслугу, прасіць прабачэння, звяртацца па дапамогу да дарослых і равеснікаў;

культурна паводзіць сябе дома, у школе, грамадскіх месцах, транспарце;

арыентавацца ў кватэры, школьным будынку, школьным двары;

звяртацца да настаўнікаў па імені і імені па бацьку;

добрасумленна выконваць абавязкі дзяжурнага;

сервіраваць стол да абеду, прыбіраць посуд;

распазнаваць сапсаваныя прадукты па змене колеру, паху;

выбіраць адзенне, абутак па сезоне, самастойна апранацца, распранацца, акуратна насіць адзенне і абутак, даглядаць прадметы гардэробу;

выконваць правілы асабістай гігіены, выкарыстоўваць прадметы гігіены пры ранішнім і вячэрнім туалеце, раскладваць іх па месцах;

называць віды транспарту, выконваць правілы пасажыра і пешахода;

адрозніваць аб’екты жывой і нежывой прыроды;

называць і паказваць найбольш распаўсюджаныя ў пэўнай мясцовасці расліны, жывёл, выяўляць іх значэнне ў жыцці чалавека; праяўляць клопат аб раслінах і жывёлах;

расказваць пра лад жыцця і звычкі дзікай і свойскай жывёлы, птушкі.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

самастойна арыентуюцца ў школьных памяшканнях, школьным двары, на спартыўнай пляцоўцы;

знаходзяць сваё працоўнае месца ў класе; рыхтуюцца да ўрокаў, выбіраюць адпаведныя вучэбныя прылады;

выконваюць рэжым дня школьніка;

праяўляюць культуру паводзін у грамадскіх месцах;

выкарыстоўваюць маўленчыя формулы для размовы па тэлефоне ў розных сітуацыях;

назіраюць за надвор’ем і сезоннымі зменамі ў прыродзе;

даглядаюць пакаёвыя расліны;

адрозніваюць у прыродзе і на малюнках найбольш распаўсюджаных прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага светаў;

удзельнічаюць у зборы прыроднага матэрыялу;

выбіраюць адзенне і атрыбуты ў адпаведнасці з парой года.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

прадметныя ўяўленні (веды) і ўменні ў навучальных і натуральных сітуацыях, якія патрабуюць самастойнага выбару;

прадметныя ўяўленні (веды) і ўменні ў гульнях-драматызацыях, інсцэніроўках («Дзень нараджэння мамы», «Сустракаем гасцей», «Выклікаем урача»), доследнай дзейнасці (вызначэнне спеласці

садавіны, яе прыдатнасці да ўжывання ў ежу па асаблівасцях знешняга выгляду);

адлюстроўваюць у вучэбнай, гульнявой і прадуктыўнай дзейнасці сувязі і залежнасці, даступныяназіранню і свайму разуменню: чысціня пітной вады – здароўе чалавека; чысціня паветра – наяўнасць зялёных раслін; чысціня паветра, якім мы дыхаем, – здароўе чалавека; выкананне правіл гігіены памяшканняў – клопат аб здароўі; узыход сонца – пацяпленне, заход сонца – пахаладанне.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

вітацца пры сустрэчы, развітвацца пры расставанні, дзякаваць за паслугу, прасіць прабачэння ў выпадку прычынення нязручнасці, віншаваць са святам, звяртацца па дапамогу;

адказваць на пытанні пра сябе, сваю сям’ю, называць імёны членаў сям’і;

выконваць свае абавязкі ў сям’і; абавязкі дзяжурнага ў школе;

вызначаць эмацыянальны стан людзей навокал, аналізаваць характар учынку (добры, дрэнны), адпаведна паводзіць сябе;

самастойна рыхтавацца да ўрокаў; выконваць рэжым дня, правілы асабістай гігіены;

арыентавацца ў часе і прасторы, выкарыстоўваць у мове словы, якія характарызуюць нескладаныя часавыя і прасторавыя ўзаемаадносіны;

вызначаць залежнасці паміж умовамі жыцця, знешнімі функцыянальнымі ўласцівасцямі прадстаўнікоў жывёльнага і расліннага светаў;

вызначаць прычынна-выніковыя залежнасці паміж станам прыроды, дзейнасцю людзей і порамі года;

дагледаць пакаёвыя расліны; выконваць простыя сезонныя работы ў агародзе;

арыентавацца ў сігналах святлафора, дарожных знаках (падземны пераход);

пазнаваць аб’ект па ўмоўных абазначэннях (шыльдзе, надпісе);

распазнаваць небяспеку ў навакольным асяроддзі, пазбягаць яе, своечасова звяртацца па дапамогу.

## V КЛАС
## (35 гадзін)
## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ
## «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (14 гадзін)

### Прадметы побыту і працы людзей (4 гадзіны)

Адзенне, абутак: прызначэнне, віды, спосабы догляду, беражлівае стаўленне. Выбар адзення па колеры і фасоне, падбор да яго аксесуараў у залежнасці ад сітуацыі, індывідуальных асаблівасцей і патрэб чалавека.

Залежнасць тэрмінаў нашэння адзення і абутку ад акуратнага і беражлівага выкарыстання.

Посуд, яго разнастайнасць; значэнне ў побыце. Прызначэнне посуду: кухонны, сталовы (чайны, кававы). Выкарыстанне розных відаў посуду. Матэрыял, з якога зроблены посуд (шкло, гліна, метал, пластмаса, дрэва), яго ўласцівасці. Беражлівае стаўленне да посуду, меры бяспекі пры абыходжанні з ім (далікатны, гарачы).

Сервіроўка стала (абедзеннага, святочнага, да чаяпіцця). Прыбіранне стала. Мыццё і чыстка посуду. Мыйныя сродкі, меры бяспекі пры абыходжанні з імі.

Электрабытавыя прыборы (электрачайнік, мікрахвалевая печ, кававарка і іншыя). Прызначэнне электрапрыбораў і правілы іх выкарыстання. Тэхніка бяспекі пры карыстанні электрапрыборамі. Служба выратавання (тэлефон 101).

Прадметы рукатворнага свету: уласцівасці, якасці, матэрыялы, з якіх яны выраблены. Бытавыя прылады працы (малаток, абцугі, піла, сякера, адвёртка), іх прызначэнне, выкарыстанне ў побыце. Правілы тэхнікі бяспекі пры абыходжанні з прыладамі працы. Культура працы.

Практычная дзейнасць

Называнне і паказванне прадметаў з розных класіфікацыйных груп. Адрозніванне прадметаў па істотных прыметах. Практыкаванне ў рацыянальным і бяспечным выкарыстанні прадметаў і прылад працы. Практычныя дзеянні па выяўленні ўласцівасцей і якасцей прадметаў. Прытрымліванне правіл культуры працы: падрыхтоўка працоўнага месца, мэтанакіраванае размяшчэнне прылад працы, падтрыманне парадку на працоўным месцы, акуратнасць падчас выканання работы.

Праца людзей (4 гадзіны)

Праца людзей у гарадской і сельскай мясцовасці. Прафесіі сельскіх жыхароў (аграном, трактарыст, камбайнер, жывёлавод). Характар і змест працы вяскоўцаў (сувязь працы сельскіх жыхароў і пор года). Вынік працы – прадукты харчавання (мяса, малако, хлеб, агароднiна). Разнастайнасць прафесій гарадскіх жыхароў, характар і змест іх работы (пазменная работа, незалежнасць ад пары года). Прадукцыя, вырабленая прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь: прадметы штодзённага карыстання, абсталяванне, машыны, бытавая тэхніка.

Прамысловыя аб’екты горада: фабрыкі, заводы, будаўнічыя пляцоўкі. Прадукцыя фабрык і заводаў, неабходная для жыцця людзей.

Будаўнічыя аб’екты, іх прыметы. Будаўнічыя прафесіі: маляр, тынкоўшчык і іншыя. Змест і вынік працы кожнага; узаемасувязь прафесій. Меры прафілактыкі траўматызму на будоўлі.

Калектыўная праца. Добрасумленнае стаўленне людзей да працы. Залежнасць якасці прадукцыі ад добрасумленнасці кожнага работніка.

Узаемадапамога ў працоўным калектыве. Павага да працы людзей. Якасці работнікаў: працавітасць, стараннасць, акуратнасць, добрасумленнасць.

Практычная дзейнасць

Назіранні за працай дарослых падчас экскурсій, мэтавых прагулак. Пасільны ўдзел у працы дарослых. Канструяванне дамоў з дэталей канструктара.

Мой горад (пасёлак, сельскі населены пункт) (4 гадзіны)

Арганізацыі аховы здароўя (паліклінікі, бальніцы, прыватныя медыцынскія цэнтры і іншае), іх прызначэнне. Прафесіі людзей, якія працуюць у арганізацыях аховы здароўя. Асаблівасці амбулаторнага і стацыянарнага лячэння.

Установы культурна-бытавога абслугоўвання (майстэрні, атэлье, дамы быту), іх прызначэнне. Атэлье, майстэрні, іх прызначэнне. Разнастайнасць паслуг. Выбар паслуг у залежнасці ад патрэбнасцей заказчыка. Прафесіі людзей, якія працуюць у атэлье і майстэрнях. Знаходжанне атэлье, майстэрні па ўмоўных абазначэннях, шыльдах. Правілы здачы ў рамонт абутку, афармленне заказу. Дом быту: яго прызначэнне, месцазнаходжанне, зручнасць у карыстанні паслугамі.

Установа сувязі – пошта. Афармленне і адпраўленне па пошце лістоў і бандэролей. Правілы перасылкі карэспандэнцыі (указанне адраса: індэкса, назваў населенага пункта, вуліцы, нумара дома). Сродкі сувязі (тэлефон, інтэрнэт).

Віды транспарту, іх прызначэнне. Транспарт грузавы і пасажырскі, грамадскі і асабісты. Прафесіі людзей, якія кіруюць транспартам (кіроўца (вадзіцель), машыніст, капітан, лётчык). Машыны спецыяльнага прызначэння. Прафесіі людзей, якія аказваюць дапамогу людзям (пажарны, міліцыянер, урач). Меры бяспечных паводзін у транспарце.

Практычная дзейнасць

Экскурсіі, мэтавыя прагулкі ў горад (пасёлак, сельскі населены пункт). Знаходжанне ўстаноў горада па шыльдах. Разыгрыванне сітуацый «Наведванне Дома быту», «У чарзе», «Наведванне паліклінікі», «Размова па тэлефоне», «У аўтобусе». Сюжэтна-ролевыя гульні «Пошта», «Майстэрня па рамонце абутку», «Цырульня».

Мая краіна (2 гадзіны)

Галоўны горад краіны, яго славутасці. Нацыянальная сімволіка краіны. Буйныя гарады Рэспублікі Беларусь: Гродна, Гомель і іншыя. Суседзі маёй краіны: Расія, Украіна, Літва і іншыя, іх сталіцы, славутасці. Народныя святы і звычаі. Беларускія народныя святы (Купалле, Дзяды).

Прырода роднага краю: лясы, запаведнікі, буйныя рэкі (Днепр, Нёман, Дзвіна, Прыпяць), азёры (Нарач, Белае), іх значэнне ў прыродзе і жыцці чалавека.

Практычная дзейнасць

Называнне сталіцы нашай краіны, яе славутасцей, буйных гарадоў, рэк. Пазнаванне пейзажаў роднага краю ў творах пісьменнікаў, мастакоў.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА» (15 гадзін)

### Нежывая прырода (5 гадзін)

Аб’екты нежывой прыроды. Цяпло і святло – найважнейшыя ўмовы жыцця на Зямлі. Сонца – крыніца цяпла і святла. З’явы і станы нежывой прыроды: воблачнасць, туман, дождж, завіруха, спякота, лістапад, замаразкі, адліга. Вышыня сонца над гарызонтам у розныя поры года (напрамак сонечных прамянёў, колькасць цяпла і святла). Узыход, заход сонца. Змяненне працягласці дня і ночы.

Вада – умова існавання ўсяго жывога. Вада прэсная, салёная, мінеральная. Уласцівасці вады: цякучасць, празрыстасць. Стан вады (вадкі – вада, цвёрды – лёд, снег, газападобны – пара). Значэнне вады ў жыцці чалавека, прыродзе. Выкарыстанне вады ў побыце, вытворчасці прадукцыі. Рэкі і азёры. Кругаварот вады ў прыродзе. Прычыны забруджвання вады. Беражлівае стаўленне да вады. Правілы паводзін паблізу вадаёмаў.

Паветра – аснова дыхання. Значэнне паветра ў жыцці чалавека, раслін, жывёл. Крыніцы забруджвання паветра. Уздзеянне забруджанага і чыстага паветра на здароўе і жыццядзейнасць чалавека, стан жывёл і раслін. Лес – санітар паветра. Правілы паводзін у лесе.

Глеба, яе значэнне для раслін, жывёл, чалавека. Стан глебы (рыхлая, цвёрдая, сухая, вільготная). Залежнасць знешняга выгляду раслін ад стану глебы (вянуць і апускаюцца ўніз лісты, павольны рост і гэтак далей). Роля чалавека ў захаванні ўрадлівасці глебы.

Карысныя выкапні Беларусі (пясок, гліна, соль), іх практычнае значэнне ў жыцці чалавека. Гаручыя карысныя выкапні: нафта, торф, іх уласцівасці, практычнае прымяненне (торф, нафта – угнаенне, паліва). Наступствы няправільнага выкарыстання гаручых карысных выкапняў (забруджванне вадаёмаў, навакольнага асяроддзя).

Гаспадарчая дзейнасць чалавека і яе ўплыў на прыродныя працэсы. Беражлівае стаўленне да прыроды, адказнасць за захаванне аб’ектаў жывой і нежывой прыроды.

Практычная дзейнасць

Адрозніванне (называнне і паказванне) прыродных аб’ектаў і прадметаў, створаных рукамі чалавека. Класіфікацыя, абагульненне, канкрэтызацыя аб’ектаў прыроды. Назіранні за аб’ектамі прыроды.

Доследы і практычныя дзеянні з вадой, паветрам. Параўнанне чыстай і бруднай вады. Практычныя дзеянні па зберажэнні і эканомным расходаванні вады. Аказанне дапамогі дарослым падчас прыбірання памяшканняў (выціранне пылу, праветрыванне).

Раслінны свет (4 гадзіны)

Агульныя і адметныя прыметы дрэў, кустоў, травяністых раслін. Умовы жыцця раслін: глеба, вада, паветра, святло. Выяўленне недахопу асобных умоў па знешнім выглядзе расліны.

Лес – месца росту раслін і пражывання жывёл. Значэнне лесу ў жыцці чалавека. Правілы паводзін у лесе падчас адпачынку, збору ягад, грыбоў, арэхаў.

Дзікарослыя расліны: елка, сасна, бяроза. Знешні выгляд, месцы і асаблівасці росту.

Культурныя расліны (расліны саду, агарода). Знешні выгляд, месцы і ўмовы росту, залежнасць ад догляду чалавека.

Культурныя расліны поля – жыта, пшаніца, грэчка, авёс, лён, іх значэнне ў жыцці чалавека. Прадукты харчавання з жытняй, пшанічнай мукі, аўса, грэчкі.

Расліны балот (журавіны, буякі, чарот, расянка, сфагнум – тарфяны мох).

Размнажэнне раслін насеннем і чаранкамі. Падрыхтоўка глебы да пасадкі насення. Умовы і стадыі развіцця расліны (насенне, парастак, сцябло з лісцем, кветка, плод). Догляд раслін.

Практычная дзейнасць

Адрозніванне раслін найбліжэйшага асяроддзя па знешніх прыметах, лісці, пладах. Распазнаванне ліставых і хвойных дрэў. Класіфікацыя (дрэвы, кусты, травяністыя расліны). Паказванне і называнне частак раслін у прыродзе і на карцінках. Практычная работа з гербарнымі ўзорамі. Назіранне за ростам і развіццём расліны ў спецыяльна створаных умовах. Параўнанне агародніны, садавіны па велічыні, колеры, форме, смаку, месцы росту. Называнне сваёй любімай агародніны, садавіны.

Падрыхтоўка глебы да сяўбы насення. Догляд раслін: рыхленне глебы, апырскванне, глыбокая перакопка, перасадка, выдаленне сухога лісця, выдаленне пустазелля, збор ураджаю на прышкольным участку.

Жывёльны свет (4 гадзіны)

Разнастайнасць прадстаўнікоў жывёльнага свету: звяры, птушкі, рыбы, насякомыя і іншыя. Адрозненні жывёл ад раслін. Выкарыстанне раслін жывёламі.

Знешні выгляд жывёл, звычкі, голас, ежа, месцы пражывання, спосабы здабывання ежы. Прыстасаванні жывёл, птушак для перамяшчэння, абароны ад ворагаў.

Уплыў асаблівасцей харчавання, месца пражывання на знешнюю будову жывёл. Змены ў іх ладзе жыцця і знешнім выглядзе ў залежнасці ад пары года (афарбоўка шэрсці, апярэння, нарыхтоўка корму на зіму, спячка).

Свойская і дзікая жывёла: падабенства і адрозненні па знешнім выглядзе, месцы пражывання (свойская жывёла жыве побач з чалавекам, мае патрэбу ў доглядзе і кармленні; дзікія звяры жывуць удалечыні ад чалавека, самастойна здабываюць сабе ежу).

Траваедныя жывёлы: заяц, вавёрка, карова, каза і іншыя. Спосабы іх харчавання. Называнне дарослых жывёл і дзіцянят.

Драпежныя жывёлы: воўк, ліса і іншыя. Знешні выгляд, звычкі, асаблівасці харчавання, дзіцяняты.

Усёедныя жывёлы: мядзведзь, вожык, свіння і іншыя. Адрозненні ад драпежных і траваедных жывёл па спосабе харчавання. Карысныя і шкодныя жывёлы (шкода і карысць для чалавека, іншых жывёл, народнай гаспадаркі).

Жывёлы поля: курапатка, жаваранак, мыш, заяц. Барацьба птушак з насякомымі-шкоднікамі.

Жывёлы, якія жывуць на балоце: чапля, шэры журавель, сава, бусел, вуж, гадзюка.

Практычная дзейнасць

Называнне ўмоў, неабходных для росту жывых арганізмаў (з апорай на малюнак-схему). Назіранні за свойскай і дзікай жывёлай, зімуючымі птушкамі, рыбамі. Гульні «Назаві і пакажы звяроў (птушак, насякомых, рыб)», «Хто – звер, а хто – птушка», «Хто ведае – далей працягвае», «Хто дзе жыве», «Пачастунак для жывёл», «Хто як голас падае». Практыкаванне «Раскажы пра жывёлу» (з апорай на схему). Вылучэнне істотных прымет, групаванне і класіфікацыя аб’ектаў прыроды, якія вывучаюцца. Удзел у доглядзе жывёлы (кармленне рыбак у акварыуме, замена вады і гэтак далей), у прыродаахоўных мерапрыемствах.

Поры года (2 гадзіны)

Паслядоўнасць пор года, месяцаў (восеньскіх, зімовых, вясновых, летніх). Характэрныя прыметы і з’явы кожнай пары года. Сезонныя змены ў прыродзе, жыцці людзей, раслін, жывёл.

Практычная дзейнасць

Назіранні за надвор’ем і прыроднымі аб’ектамі ў розныя поры года, выяўленне характэрных прымет, іх апісанне, фіксацыя; вядзенне календара прыроды. Удзел у сезоннай працы дарослых. Называнне пор і месяцаў года ў пэўнай паслядоўнасці.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (6 гадзін)

### Асабістая гігіена (2 гадзіны)

Прадметы асабістай гігіены: назва, прызначэнне, месцазнаходжанне. Правілы асабістай гігіены, іх выкананне. Асаблівасці гігіены хлопчыкаў і дзяўчынак. Гігіена скуры. Пастава. Папярэджванне скрыўлення пазваночніка.

Зубы малочныя і пастаянныя. Догляд поласці рота. Прафілактыка хвароб зубоў.

Харчаванне, яго значэнне для чалавека. Разнастайнасць і рэжым харчавання. Раслінная і жывёльная ежа. Гігіена месца і працэсу ўжывання ежы. Бяспека і акуратнасць выкарыстання посуду, сталовых прыбораў. Распазнаванне дабраякасных і няякасных прадуктаў харчавання.

Гігіена адзення і абутку. Разуменне і вызначэнне неабходнасці догляду адзення, абутку. Правілы і спосабы догляду адзення, абутку (мыццё, сушка, акуратнае захоўванне, захаванне чысціні і іншыя).

Гігіена памяшкання. Значэнне чысціні ў памяшканні. Вільготнае прыбіранне, праветрыванне. Прадметы для прыбірання і падтрымання чысціні ў памяшканні (шчоткі, сурветкі, швабры, бытавая хімія). Скразнякі, іх прычыны, небяспека для здароўя, меры засцярогі.

#### Практычная дзейнасць

Складанне расказу аб сваім самаадчуванні. Дэманстрацыя дзеянняў па выкананні гігіенічных працэдур, вячэрняга туалету, гатоўнасці да сну. Дыдактычныя гульні «Правільна – няправільна», «Што трэба зрабіць, каб ...», «Што мне трэба для сну». Адпрацоўка спосабаў пераадолення стомленасці: змена дзейнасці, праветрыванне памяшкання, фізкультхвілінка, зрокавая гімнастыка, рэлаксацыйныя практыкаванні, псіхагімнастыка.

### Рэжым – залог здароўя (2 гадзіны)

Асаблівасці чалавечага арганізма: працаздольнасць і стомленасць. Залежнасць працаздольнасці ад стану здароўя чалавека і стану навакольнага асяроддзя. Працаздольнасць вучняў. Выкананне рэжыму – залог здароўя і поспеху ў рабоце. Рэжым працы і адпачынку ў школе, дома. Чаргаванне ўрокаў і перапынкаў; значэнне перапынкаў для здароўя вучняў.

Рэжым сну, яго значэнне для здароўя чалавека. Гігіенічныя працэдуры перад сном. Прыналежнасці для сну. Значэнне ранішняй гімнастыкі, прагулкі, фізкультурных практыкаванняў, рухомых гульняў для ўмацавання здароўя.

#### Практычная дзейнасць

Складанне і выкананне рэжыму дня.

Прафілактыка захворванняў (2 гадзіны)

Клопат аб сваім здароўі. Фактары, якія ўмацоўваюць і аслабляюць здароўе. Залежнасць здароўя чалавека ад яго ладу жыцця. Меры прафілактыкі прастудных, страўнікава-кішачных захворванняў. Своечасовы зварот да ўрача медпункта па медыцынскую дапамогу, выклік урача дамоў, выклік хуткай медыцынскай дапамогі (паведамленне звестак пра сябе: прозвішча, імя, узросту, адраса, прымет захворвання). Прафілактыка траўматызму ў школе, побыце, на вуліцы. Папярэджванне шкодных звычак.

Практычная дзейнасць

Складанне правіл паводзін падчас хваробы. Дэманстрацыя дзеянняў па доглядзе хворага. Складанне спісу мер бяспекі пры зносінах з хворым чалавекам. Замалёўкі на тэму «Мы супраць курэння», «Алкаголь – вораг здароўя».

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

аб неабходнасці падтрымання добразычлівых адносін з сябрамі, аднакласнікамі, настаўнікамі, членамі сям’і, суседзямі;

прызначэнні, спосабах выкарыстання прадметаў навакольнай рэчаіснасці;

правілах бяспекі пры выкарыстанні бытавых прыбораў, прылад працы (пад кантролем дарослага);

раслінах саду, агарода, лесу; культурных і дзікарослых раслінах;

паслядоўнасці пор года, сезоннай працы людзей, сезонных зменах у жыцці раслін, жывёл;

правілах догляду раслін і жывёл;

месцах пражывання жывёл, спосабах іх харчавання, сродках аховы ад ворагаў, холаду;

найбліжэйшых да дому і школы ўстановах, прадпрыемствах, іх умоўных абазначэннях;

відах, спосабах перамяшчэння транспарту, прафесіях людзей, якія кіруюць транспартам;

абавязках пешахода, пасажыра;

прафесіях людзей, значнасці іх працы, інструментах, неабходных для работы;

характары і змесце прафесій сельскіх і гарадскіх жыхароў, беражлівым стаўленні да вынікаў іх працы;

назвах сваёй рэспублікі, краін-суседак, іх славутасцях, прадукцыі прадпрыемстваў.

Уменні:

выконваюць хатнія абавязкі, абавязкі дзяжурнага ў школе;

акуратна выкарыстоўваюць школьныя прылады, самастойна рыхтуюцца да ўрокаў;

пазнаюць прадметы найбліжэйшага акружэння па характэрных прыметах;

адрозніваюць і называюць прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага светаў, найбольш распаўсюджаных у той ці іншай мясцовасці;

вызначаюць уласцівасці, якасці прадметаў, матэрыял, з якога яны зроблены;

выконваюць практычнае групаванне, класіфікацыю вывучаных аб’ектаў па істотнай прымеце;

параўноўваюць аб’екты, якія назіраюць;

вызначаюць сувязі і прычынна-выніковыя залежнасці, даступныя назіранню і свайму разуменню;

вызначаюць паслядоўнасць падзей у прыродным і сацыяльным свеце;

выконваюць сезонныя работы на прышкольным участку;

разумеюць асаблівасці ўзаемадзеяння чалавека і прыроды, значэнне стану прыроды для здароўя і жыццядзейнасці чалавека;

выконваюць правілы гігіены, своечасова ліквідуюць недахопы ў знешнім выглядзе адзення, абутку;

пазнаюць і называюць дзяржаўныя сімвалы – герб, сцяг, гімн; гістарычныя помнікі роднага горада (сяла);

прытрымліваюцца мер прафілактыкі інфекцыйных прастудных, страўнікава-кішачных захворванняў, выконваюць патрабаванні ўрача і дарослых пры захворванні.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

самастойна арыентуюцца ў школьных памяшканнях, школьным двары, на спартыўнай пляцоўцы;

рыхтуюцца да ўрокаў, выбіраюць адпаведныя вучэбныя прылады;

класіфікуюць і параўноўваюць прадметы па зададзеных прыметах, вызначаюць істотныя прыметы групы прадметаў;

назіраюць за надвор’ем, ростам раслін, звычкамі жывёл, сезоннымі зменамі ў прыродзе;

параўноўваюць прадметы па зададзеных прыметах;

выбіраюць адзенне і абутак у адпаведнасці з парой года, самастойна апранаюцца, распранаюцца, абуваюцца, разуваюцца;

даглядаюць сваё адзенне, абутак;

даглядаюць пакаёвыя расліны;

адрозніваюць у прыродзе і на малюнках найбольш распаўсюджаных прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага светаў;

вызначаюць залежнасці паміж умовамі жыцця, знешнімі функцыянальнымі ўласцівасцямі прадстаўнікоў жывёльнага і расліннага

светаў;

вызначаюць прычынна-выніковыя залежнасці паміж станам прыроды, дзейнасцю людзей і порамі года.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

прадметныя веды і ўменні ў навучальных і натуральных сітуацыях;

прадметныя веды і ўменні ў гульнях-драматызацыях;

прадметныя веды і ўменні ў доследнай дзейнасці («Этапы росту цыбулі», «З’яўленне лісточкаў з пупышак»);

адлюстроўваюць у вучэбнай, прадуктыўнай дзейнасці:

сувязі і залежнасці, даступныя назіранню і свайму разуменню ўзаемасувязі паміж жывой і нежывой прыродай;

стан аб’ектаў прыроды і дзейнасць чалавека па іх ахове;

прыстасаванні жывёл да ўмоў пражывання, спосабаў харчавання.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

вітацца пры сустрэчы, развітвацца пры расставанні, дзякаваць за паслугу, прасіць прабачэння, віншаваць са святам, прымаць віншаванні, звяртацца па дапамогу;

адказваць на пытанні пра сябе, сваю сям’ю, называць імёны членаў сям’і;

ацэньваць свае і чужыя паводзіны, праяўляць эмпатыю, паважліва і клапатліва ставіцца да старэйшых і малодшых;

вызначаць эмацыянальны стан (свой і іншых людзей) у розных сітуацыях (рэальных або адлюстраваных на малюнку), суадносіць іх з дзеяннямі людзей навокал;

паведамляць аб сваім стане, асабістых перавагах, жаданнях;

выконваць просьбы, даручэнні дарослых і равеснікаў;

несці адказнасць за свае ўчынкі;

выконваць правілы паводзін дома, у школе, на вуліцы, у грамадскіх месцах, транспарце;

праяўляць культуру зносін пры ўзаемадзеянні з равеснікамі і дарослымі;

звяртацца да дарослага для вырашэння разнастайных бытавых, экстрэмальных, небяспечных сітуацый;

перадаваць назвы аб’ектаў прадметнага і сацыяльнага светаў.